*М.М. Караткоў*

# РАМАН І. ШАМЯКІНА "КРЫНІЦЫ": АСАБЛІВАСЦІ КАНФЛІКТАЎ І ШЛЯХІ РАСКРЫЦЦЯ ХАРАКТАРАЎ ЛІТАРАТУРНЫХ ГЕРОЯЎ У ІХ КАНТЭКСЦЕ

У самым пачатку кастрычніка 1954 года ў газеце "Гомельская праўда"[1] з'явілася невялікае апавяданне І. Шамякіна "Стары настаўнік". У яго падзагалоўку значылася: "*урывак з новага рамана*". То быў невялікі фрагмент рамана "Крыніцы", над якім тады працаваў яшчэ малады, але ўжо вядомы празаік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, якой быў адзначаны яго першы раман "Глыбокая плынь" (1948). Гэта быў адзін з лепшых у тагачаснай савецкай літаратуры твораў аб Вялікай Айчыннай вайне. Даволі высока быў ацэнены крытыкай і другі, апублікаваны ў 1953 годзе, раман "У добры час". У ім паказвалася жыццё сельскай інтэлігенцыі і калгаснікаў у першыя пасляваенныя гады. Аднак сам аўтар, відаць, не лічыў яго вялікай творчай удачай. Значна пазней ён адзначаў, што рэабілітаваў сябе і сельскую тэму раманам "Крыніцы"[2]. Ён стаў этапным у творчасці пісьменніка і наватарскай з'явай у тагачаснай літаратуры не толькі Беларусі, але і ўсяго былога Савецкага Саюза.

Задума рамана "Крыніцы" ўзнікла пад уплывам перамен, якія пачаліся ў жыцці грамадства неўзабаве пасля смерці І.В. Сталіна. Сёння далёка не кожны чытач мае выразнае ўяўленне аб рэаліях тых далёкіх часоў, без якога цяжка зразумець многія эпізоды ў рамане. Таму, думаецца, не лішне будзе акрэсліць найбольш істотныя рысы рэчаіснасці таго перыяду, калі пісьменнік працаваў над "Крыніцамі".

І пачнем, відаць, з 5 сакавіка 1953 года, дня смерці І.В. Сталіна. Многія ўспрынялі яе як катастрофу для краіны. Праз шмат гадоў І. Шамякін успамінаў наступнае.

*"Запомніліся эпізоды ў дзень смерці Сталіна. Маша разбудзіла мяне ў шэсць раніцы з рыданнямі.*

*"Памёр..."*

*Я таксама заплакаў. Сапраўды, здалося, што свет перавярнуўся, парушаны ўсе ўстоі, жыццё бурыцца і мы ляцім у тартарары. <...> пайшлі на*

---

[1] Гомельская праўда. – 1954. – 3 каст.

[2] *Шамякін, І.* Начныя ўспаміны / І. Шамякін // Полымя. – 2003. – № 9. – С. 3.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*плошчу, дзе стаяў гіганцкі манумент правадыра. Быў моцны для сакавіка мароз – градусаў 15. На плошчу з усіх бакоў ішлі людзі. Старэнькія бабулі неслі вазоны кветак, якія тут жа мёрзлі, але манумент быў абстаўлены гаршкамі. Ці ўсе плакалі? Безумоўна, не ўсе – колькі было пакрыўджаных. Але яны маўчалі"*[3].

Жалобныя мітынгі са сцягамі, кветкамі і слязамі праходзілі па ўсёй краіне. Аднак паступова настроі ў грамадстве пачалі мяняцца. Праз колькі дзён пасля таго, 16 сакавіка, была абнародавана пастанова Пленума ЦК КПСС, які прайшоў пад кіраўніцтвам сакратара ЦК і першага сакратара Маскоўскага гаркома КПСС М.С. Хрушчова. Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, згодна гэтай пастанове, стаў К.Я. Варашылаў, старшынёй Савета Міністраў – Г.М. Малянкоў. Яго намеснікамі былі прызначаныя Л.П. Берыя, В.М. Молатаў, М.А. Булганін, Л.М. Кагановіч і А.І. Мікаян. У жыцці краіны пачаўся новы этап. І многія, як адзначаў пісьменнік, пачалі цверазець: *"унутрана, інтуітыўна я адчуваў, што далей так жыць нельга, што жыццё са смерцю Сталіна не спынілася. Наадварот. Набыло іншы сэнс"*[4]. Пачаўся перыяд, пераходны ад часоў культу асобы Сталіна да так званай "хрушчоўскай адлігі", пачаткам якой лічыцца XX з'езд КПСС, што адбыўся ў 1956 годзе.

І. Шамякін адзначаў пра той час наступнае.

*"Жыццё, ідэалогія, не саступаючы з марксісцка-ленінскіх пазіцый, набывала нейкія, пакуль што нам, радавым, незразумелыя адценні, нюансы. Я гэта адчуў на пленуме ЦК КПБ, які адбыўся ў чэрвені* [1953 г. – *М.К.*] *і на якім я, сакратар партарганізацыі, прысутнічаў"*[5]. Пленум гэты працягваўся тры дні і вызначаўся драматызмам, *"якога людзі майго пакалення не помнілі. Хіба камуністы 20-х помнілі"*[6].

На парадку дня стаяла пытанне аб замене М.С. Патолічава, першага сакратара ЦК Беларусі. У Мінск прыехаў М.В. Зімянін, які павінны быў стаць на чале рэспублікі, і стаў фактычна кіраваць ёй, не чакаючы рашэння пленума. Лічыў, відаць, пытанне вырашаным - пры жыцці І.В. Сталіна рэкамендацыі цэнтра фактычна з'яўляліся дырэктывамі, абмеркаванне якіх магло быць толькі фармальным. Аднак часы змяніліся. Як адзначаў пісьменнік, людзі, *"якія доўга маўчалі і згаджаліся, страцілі пакорнасць"*[7]. Яны настойвалі на тым, каб М.С. Патолічаў заставаўся на сваёй пасадзе. Адбывалася небывалае – кіраўніцтва пленума не магло правесці патрэбнае рашэнне. Самае ж, бадай, галоўнае было тое, што пасля надта зацягнутага перапынку ў апошні,

---

[3] *Шамякін, І.* Роздум на апошнім перагоне / І. Шамякін // Мінск: Маст. літ.,1998. – С. 240–241.
[4] *Шамякін, І.* Роздум на апошнім перагоне... – С. 240.
[5] Шамякін, І. Начныя ўспаміны... – С. 38.
[6] Шамякін, І. Роздум на апошнім перагоне... – С. 242.
[7] Тамсама. – С. 244.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

трэці дзень пасяджэнняў, было аб'яўлена: Прэзідыум ЦК КПСС параіў *"у сувязі з тым, што пленум аказаў таварышу Патолічаву поўны давер, пакінуць яго на пасадзе першага сакратара"*[8].

Той факт, што пытанне аб кіраўніку рэспублікі было вырашана яе партыйнай арганізацыяй не так, як планаваў пленум ЦК КПСС, і што рашэнне гэтае было зацверджана цэнтрам, абуджаў надзею на дэмакратызацыю партыйнага жыцця. Вельмі падобна было на тое, што ранейшыя парадкі адыходзяць у нябыт. Павеяла ветрам палітычнай адлігі.

Аб гэтым сведчыла і з'яўленне на старонках друку першых з цыклу нарысаў В. Авечкіна "Раённыя будні", і публікацыя ў ліпеньскім нумары часопіса "Полымя" за той жа 1953 год камедыі А. Макаёнка "Выбачайце, калі ласка". У гэтых творах упершыню за многія гады адкрыта гаварылася аб многіх негатыўных з'явах у жыцці, крытыкаваліся заганныя метады кіраўніцтва, прычым адмоўнымі персанажамі былі і камуністы – кіраўнікі раённага звяна. Такога ў часы сталіншчыны і быць не магло.

Рэаліі тых далёкіх часоў памятае цяпер толькі старэйшае пакаленне чытачоў. Таму, відаць, не лішне будзе сказаць колькі слоў аб жыцці вёскі ў пачатку 50-х гадоў мінулага стагоддзя. Пачнем з таго, што тады ўласнай тэхнікі калгасы не мелі. Апрацоўвалі іх зямлю і ўбіралі ўраджай па дагаворах машына-трактарныя станцыі (МТС), якія былі самастойнымі арганізацыямі. Іх сіл для забеспячэння ўсяго фронту работ не хапала. Да таго ж тэхніка часта псавалася, бо працавалі на ёй сезонныя работнікі, большасць з якіх не мела належнай падрыхтоўкі. Нізкая ступень механізацыі працы была адной з многіх прычын павышэння сабекошту прадукцыі, што пры нізкіх закупачных цэнах на яе, устаноўленых дзяржавай, згубна адбівалася на эканоміцы калгасаў.

Многія гаспадаркі гадамі не маглі разлічыцца з МТС, а тым больш забяспечыць прыстойны ўзровень заробку калгаснікаў. Да таго ж і выплочваўся ён нерэгулярна, звычайна раз або два ў год, і рэдка калі грашамі. Часцей за ўсё – збожжам ды гароднінай, ды й тых, асабліва ў слабых калгасах, прыпадала небагата. Нездарма працадні сяляне часта называлі "палачкамі".

Між тым селяніну трэба было заплаціць падатак і за агарод, і за кожную жывёліну ў хлеве, і за кожнае пладовае дрэва ў садзе. А апроч таго неабходна было выканаць немалыя абавязковыя пастаўкі прадуктаў жывёлагадоўлі: мяса, малака, яек, воўны. Даходзіла да таго, што сяляне нярэдка высякалі ўласныя сады, каб не плаціць падатак хаця б за іх. Многія ў калгасе працавалі больш для прыліку – абы не выгналі ды не "абрэзалі" па вокны прысядзібны ўчастак, а ўсе надзеі ўскладалі на ўласную гаспадарку: толькі з яе

[8] *Шамякін, І.* Роздум на апошнім перагоне / І. Шамякін // Мінск: Маст. літ.,1998. – С. 244.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

можна было неяк жыць. Але ж і тут хапала праблем. Сенажаці калгаснікам не выдзялялася, на працадні сена атрымлівалі мала. Даводзілася крадком (бо забаронена) касіць на няўдобіцах, балацінах, у лесе. А потым ціщком, часцей на ўласнай спіне, цягнуць накошанае дахаты. Крый Божа, пераструэне па дарозе начальства – адбяруць, як, напрыклад, старшыня калгаса Махнач у адным з эпізодаў "Крыніц".

*"– А-а, галубкі, вось калі я вас злавіў.Скідайце сена!*

*– Патап Міронавіч, у лесе сярпом нажалі. Ляснік дазволіў, - разважліва і сурова адказала старэйшая жанчына.*

*– Ведаю я вашага лесніка! Ён за пляшку ўвесь лес прадасць. Працоўную дысцыпліну зрывае! На работу не выходзіце!*

*– Усю раніцу працавалі, Патап Міронавіч. На абед ідучы, зайшлі...*

*– Ну, я размаўляць не люблю. Скідайце! А не – дык самі ведаеце...*

*– Дык чым жа карову карміць, Патап Міронавіч?*

*– Я не карміцец вашых кароў, у мяне сваіх пяцьсот штук"* [9].

Не дзіва, што многія не мелі ні сіл, ні магчымасці трымаць карову-карміліцу.

Хапала клопату і з тым, каб узараць агарод, прывезці дровы ці што іншае. Мець уласнага каня не дазвалялася. А ўзяць яго ў калгасе можна было толькі з ведама брыгадзіра ці старшыні, калі тыя нешматлікія коні былі на нейкі момант вольныя ад работы. І тое яшчэ, як паставіцца да тваёй начальства. Ёсць у рамане "Крыніцы" эпізод, калі той жа Махнач праяўляе проста бесчалавечнасць, адмаўляючыся даць каня ці машыну, каб завезці хворую калгасніцу ў бальніцу, толькі таму, што тая не выпрацавала ўстаноўленага мінімуму працадзён.

*"Што ж гэта такое? У мяне – хворая, Марфа Лукач, цяжкі прыступ, эрмінова трэба ў райбальніцу, а Патап ваш – ні машыны, ні каня... Мінімуу не выпрацавала – значыцца, памірай, так выходзіць... Што за чалавек, ожа мой!"* [117] – скардзіцца ўрач Наталля Пятроўна бухгалтару калгаса .олазу.

Асаблівыя надзеі на змены да лепшага выклікала апублікаваная ў газее "Праўда" за 15 верасня 1953 года пастанова "Аб мерах па далейшаму азвіццю сельскай гаспадаркі СССР"[10], прынятая на вераснёўскім пленуме ДК КПСС. У ёй, апрача іншага, ставілася задача на працягу 2–3 гадоў рэзз павысіць забяспечанасць насельніцтва краіны прадуктамі і палешыць

[9] *Шамякін, І.* Крыніцы / І. Шамякін: збор твораў у 5 т. – Т. 3. – Мінск: Беларусь,1968. – . 83. У далейшым пры цытаванні з гэтага тома непасрэдна ў тэксце будзе пазначацца нумар :аронкі з яго.

[10] О мерах по дальнейшему развитию сельского хозяйства СССР. Постановление Пленуа ЦК КПСС от 7.09.1953 г. // Правда. – 1953. – 15 сент.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дабрабыт калгаснікаў. Да таго ж, абвяшчалася аб спісанні ўсёй запазычанасці па абавязковых пастаўках прадукцыі жывёлагадоўлі сялянам, рабочым і інтэлігенцыі, аб неадкладным зніжэнні аб'ёмаў гэтых паставак і аб вызваленні ад іх калгаснікаў, што не мелі жывёлы, а таксама тых, хто быў вызвалены ад зямельнага падатку.

Згаданая пастанова, можна сказаць, ускалыхнула ўсю краіну. Рашэнні пленума чыталіся і абмяркоўваліся з непадробнай зацікаўленасцю, бо так ці іначай, у той ці іншай ступені яны закраналі інтарэсы кожнага, абуджалі вялікія надзеі. Насельніцтва краіны, асабліва вяскоўцы, з энтузіязмам успрынялі рашэнні вераснёўскага пленума. Людзі адчулі перспектыву. Абуджалася ініцыятыва, пачуццё ўласнай годнасці і адказнасці за справу ў радавых працаўнікоў. Асабліва гэта стала прыкметна, калі неўзабаве многія "ляжачыя" калгасы, што ўзначалілі прыехаўшыя з горада спецыялісты, мала-памалу пачалі станавіцца на ногі і нават выбівацца ў перадавыя, падаючы прыклад астатнім.

Зрухі ў палітычным і эканамічным жыцці краіны, на якія звярталася ўвага, давалі даволі важкія падставы меркаваць, што новы шлях да лепшага жыцця пачаўся, як гэта вызначылі пазней, пасля XX з'езду КПСС, у выніку вяртання да ленінскіх прынцыпаў і норм жыцця грамадства. Здавалася, што пачалася ачыстка гэтых, як тады бачылася, жыватворных крыніц стваральных сіл народа і сапраўды чалавечых адносін паміж людзьмі ад таго друзу, якім гэтыя крыніцы заплылі за часы сталіншчыны. Менавіта гэтая думка і стала лейтматывам рамана "Крыніцы", вызначыўшы і сімвалічнасць сэнсу яго назвы, і асаблівасці ідэйна-вобразнай структуры.

Літаратура, як вядома, адлюстроўвае жыццё, але ў той жа час і ўплывае на яго, уплываючы мастацкімі вобразамі на свядомасць і пачуцці чытачоў. Раман "Крыніцы", над якім распачаў тады працу пісьменнік, меўся стаць яго непасрэдным водгукам як мастака слова і грамадзяніна, чалавека таго часу на тое, што адбывалася ў краіне. І. Шамякін імкнуўся не проста адлюстраваць тагачасны стан грамадства. Не менш важна было мастацкім словам падтрымаць прагрэсіўную тэндэнцыю, спрыяць сцверджанню гуманістычных каштоўнасцей у грамадстве, паказаць, што замінае яго руху да лепшага ў плане дабрабыту і маральнага клімату жыцця. Галоўная ж перашкода таму бачылася ў рэцэдывах культу асобы. Праўда, само паняцце "культ асобы" ўзнікла пазней, пасля XX з'езду КПСС у 1956 годзе. Але, як адзначаў І. Шамякін, яшчэ задоўга да таго *"мы добра ўсведамлялі, што гэта такое, яго вытокі, яго вынікі, уздзеянне на псіхалогію людзей"*[11]. Па сведчанню пісьменніка, яшчэ пасля чэрвеньскага пленума 1953 года, на якім "пракацілі"

[11] *Шамякін, І.* Роздум на апошнім перагоне... – С. 242.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

М.В. Зіміяніна, *"у сюжэце рамана, які яшчэ пісаўся ў галаве, з'явіўся вобраз Бародкі, культаўца, злога дэмана і ахвяры (але, і ахвяры!) сістэмы сталінізму"*[12].

Безумоўна, пасля смерці В.І. Сталіна грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне паступова змянялася. Аднак сіла інерцыі мінулага была яшчэ надта вялікай. Ды й метаду сацыялістычнага рэалізму як галоўнага творчага метаду савецкай літаратуры ніхто не адмяняў. Таму і В. Авечкін, ствараючы свае нарысы "Раённыя будні", як і А. Макаёнак пішучы "Выбачайце, калі ласка", пры ўсёй сваёй бясспрэчнай грамадзянскай мужнасці, усё ж мусілі лічыцца з пэўнымі існаваўшымі табу. Заўважым, што аб'ектам крытыкі ў названых творах з'яўляюцца камуністы-кіраўнікі не вышэй раённага звяна. Думаецца, разумелі аўтары, што тыя адмоўныя з'явы ў жыцці грамадства, якія яны выкрывалі, далёка не "раённага маштабу", і з'яўляюцца яны не проста вынікам самадурства асобных кіраўнікоў. Тое ўсё было, як і самі кіраўнікі тыпу Барзова ці Каліберава, прадуктам існаваўшай палітычнай сістэмы. Але сказаць пра гэта творцы тады яшчэ не маглі. І прычынай таму, мабыць, быў нават не страх пакарання, ва ўсякім разе не толькі ён. Галоўным, відаць, было тое, што людзі ўсё ж яшчэ верылі ў ідэалы камунізму, у прагрэсіўнасць і жыццяздольнасць сацыялістычнага ладу. Верылі і ў магчымасць выправіць пад кіраўніцтвам вышэйшай партыйнай улады ўсе яго недахопы, абумоўленыя "радзімымі плямамі капіталізму" ў свядомасці асобных людзей. Відаць, не выпадкова ж у фінале камедыі А.Макаёнка паведамляецца, што ў раён, дзе "гаспадарыў" Каліберaў, прыбывае сакратар абкома партыі. А ўжо ён, як можна здагадвацца, безумоўна навядзе належны парадак.

Практычна тое ж назіраем і ў "Крыніцах". Мы не знойдзем у рамане нейкіх прыкмет адмоўнага стаўлення аўтара да існаваўшай палітычнай сістэмы ў цэлым. Наадварот, навідавоку яўнае ці ўяўнае захапленне, як тады гаварылі, калектыўным розумам партыі, якая бачыць адмоўныя з'явы, што па тых ці іншых прычынах узнікаюць у жыцці краіны, і пры першай жа магчымасці прымае меры, каб ліквідаваць іх. Аднак гаварыць аб прыхарошванні ў рамане рэалій жыцця таксама не даводзіцца. Крытычны пафас у ім, бадай, не меншы, чым у названых вышэй творах В. Авечкіна і А. Макаёнка. Іншая справа, што выяўляецца ён не так адкрыта, яскрава, што ў значнай ступені абумоўлена і спецыфікай жанраў, у якіх выступалі мастакі слова.

Як ужо адзначалася, у "Крыніцах" пісьменнік імкнуўся адлюстраваць новыя тэндэнцыі ў жыцці грамадства, якія дастаткова выразна наметіліся пасля вераснёўскага пленума. Гэтым вызначаліся асаблівасці ўсёй ідэйна-вобразнай структуры твора: яго тэматыкі, праблематыкі, вобразнай сістэмы,

[12] *Шамякін, І.* Роздум на апошнім перагоне… – С. 245.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сюжэта і кампазіцыі, прасторавыя і часавыя рамкі дзеяння. Падзеі ў творы адбываюцца ў перыяд дзесьці з сярэдзіны жніўня 1953-га да ліпеня 1954 года. Заўважым, што ў пачатку рамана калгасны рахункавод Полаз гаворыць пра новы закон аб сельгаспадатку як аб зусім нядаўняй, але ўжо мінулай падзеі, а ў фінале твора згадваюцца высокія, буйныя, але яшчэ зялёныя і мяккія каласы жыта на палетках.

Чаму часавыя межы падзей у творы вызначаны менавіта такім чынам? Вядома, з абсалютнай пэўнасцю сказаць пра гэта цяжка. Можна меркаваць, што прычын таму было, ва ўсякім разе, дзве. Па-першае, такія часавыя межы падзей у творы дазвалялі ў поўнай меры вырашыць тую задачу, якую мастак слова ставіў перад сабой. Па-другое, не лішне, відаць, будзе ўлічыць і яшчэ адну акалічнасць. Рашэнні верасмёўскага пленума, якія, кажучы словамі самога пісьменніка, *"узварухнуў не толькі сяло, але і нашага брата, пісьменніка"*[13], спрыялі паскарэнню развіцця сельскай гаспадаркі ў традыцыйных раёнах земляробства. Аднак неўзабаве гэты працэс запаволіўся. Ужо ў 1954 годзе на сакавіцкім пленуме ЦК КПСС быў абвешчаны курс на асваенне цалінных і залежных зямель. Менавіта на гэта і былі неўзабаве накіраваныя вялізныя рэсурсы, а "старая" вёска зноў аказалася як бы збоку. Пачыналася цалінная эпапея, але яна, як і ўсё, звязанае з ёю, – гэта ўжо іншая тэма.

Асаблівасцямі тэматыкі і праблематыкі рамана "Крыніцы" абумоўлены і выбар "параметраў" асноўнага месца дзеяння ў ім – вёскі Крыніцы. Гэта цэнтр параўнальна не слабога калгаса, дзе ёсць сярэдняя школа і нават свая электрастанцыя. Да таго ж побач з вёскай размяшчаецца МТС, у якой працуюць і некаторыя мясцовыя жыхары. Такая акалічнасць у многім аблягчала пабудову сюжэта, бо дазваляла пераканаўча матываваць перасячэнне жыццёвых шляхоў і ўзаемадачыненні многіх герояў твора.

Раман густа "заселены" персанажамі. Гэта і прадстаўнікі савецкіх і партыйных органаў – першы сакратар райкома партыі Бародка, старшыня райвыканкома Валатовіч, старшыня сельсавета Раўнаполец, сакратар абкома партыі Малашанка, адказны работнік ЦК Жураўскі. Кіраўнікі мясцовага калгаса – старшыня Махнач, рахункавод і парторг Полаз. Радавыя калгаснікі, сярод якіх асабліва вылучаюцца вобразы Аксінні Хвядосаўны Снягір і членаў сям'і Касцянкоў. Работнікі МТС – дырэктар Рашчэня, галоўны механік Баранаў, інжынер Сяргей Касцянок. І сельская інтэлігенцыя – урач Марозава, настаўнікі Крыніцкай школы начале з яе новым дырэктарам Лемяшэвічам. Нарэшце, вучні Крыніцкай школы.

Сам такі "набор" асноўных персанажаў дазваляў І. Шамякіну стварыць шырокае мастацкае палатно жыцця народа, паказаць змены, якія адбываліся ў ім пасля верасмёўскага пленума. А галоўнае – выявіць іх чалавечы змест,

[13] *Шамякін, І.* Роздум на апошнім перагоне... – С. 246.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выказаць свой погляд на ўзровень маральнасці грамадства, які перш за ўсё і вызначае галоўныя тэндэнцыі яго далейшага развіцця. З гэтым самым непасрэдным чынам і звязаны зварот пісьменніка да праблемы жыццёвых ідэалаў, пераадолення ўплыву культу асобы, выхавання моладзі. Гэта складае асноўную праблематыку рамана, якая абумоўлівае і асаблівасці яго сюжэту як сістэмы падзей, у якіх адлюстроўваюцца галоўныя супярэчнасці рэчаіснасці, канфлікт паміж старым і новым у жыцці, у свядомасці людзей.

Раман пачынаецца па сутнасці з таго, што ў вёску Крыніцы прыязджае на працу новы дырэктар школы Лемяшэвіч, чалавек разумны і сумленны. Такі сюжэтны ход быў даволі выйгрышным для раскрыцця зместу ўсяго твора. Бо пасада і характар працы Лемяшэвіча абумоўліваюць цесныя ўзаемадачыненні з вялікай колькасцю людзей: настаўнікаў, вучняў, калгаснага і раённага начальства, сялян, работнікаў МТС. А таму для Лемяшэвіча надзвычай важна высветліць для сябе чалавечую сутнасць кожнага з іх, што ён па меры сіл і робіць. Свежасць успрыняцца дырэктарам школы з'яў рэчаіснасці, зацікаўленасць духоўным воблікам кожнага з новых знаёмых, як і непрадузятасць яго ацэнак найлепшым чынам адпавядалі задачы раскрыцця маральнага вобліку персанажаў твора. З другога боку, непасрэднае ўзаемадзеянне Лемяшэвіча з вялікай колькасцю персанажаў твора давала даволі шырокія магчымасці ў плане арганізацыі сюжэта ўсяго твора. Менавіта таму, відаць, у яго вобразнай сістэме Лемяшэвіч і займае цэнтральнае месца, выконваючы, паміж усяго астатняга, і ролю аднаго з кампазіцыйных цэнтраў апавядання.

Разам з тым ступень узаемадзеяння цэнтральнага героя рамана з рознымі людзьмі і, адпаведна, ступень разумення сутнасці іх характараў розная. Адлюстраванне ж галоўнага канфлікту ў грамадстве як канфлікту маральнага вымагала глыбокага раскрыцця духоўнага свету выразнікаў розных тэндэнцый у жыцці грамадства. Думаецца, гэтым і абумоўлена наяўнасць у рамане многіх самастойных сюжэтных ліній, а таксама перавага ў ім фабульнага дзеяння.

Так, адносна самастойнай з'яўляецца ў рамане сюжэтная лінія ўзаемадачыненняў дырэктара МТС Рашчэні, галоўнага інжынера МТС Баранава і механіка Сяргея Касцянка. Рашчэня і Баранаў, як і многія кіраўнікі ў той час, – "практыкі", якія не маюць належнай прафесійнай падрыхтоўкі. Але Рашчэня адданы справе, а таму не саромеецца вучыцца і ў сваіх падначаленых. Ён гатовы, калі спатрэбіцца, пайсці працаваць хоць брыгадзірам, хоць трактарыстам, але не пакінуць МТС, да якой, што называецца, прыкіпеў сэрцам. Для Баранава ж найперш важная пасада. Ён не хоча хоць нешта рабіць, каб адпавядаць патрабаванням часу, і таму ўрэшце мусіць саступіць сваё месца Сяргею Касцянку, які завочна закончыў сельгасакадэмію.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вялікае значэнне маюць ў рамане і сюжэтныя лініі асабістых узаемаадносін Лемяшэвіча і Сяргея Касцянка з Наталляй Пятроўнай, Бародкі і Марыны Астапаўны, Раі Снягір і Алёшы Касцянка. Іх развіццё дазваляла пісьменніку не толькі паўней і шматгранней раскрыць характары герояў, але і выявіць свае погляды на шчасце, каханне. Зазначым, што шчасце для персанажаў рамана заключаецца перш за ўсё ў гармоніі ў іх грамадскіх справах і асабістым жыцці, шлях да якой часам бывае вельмі няпростым.

Асабістае шчасце – гэта, як паказвае пісьменнік, не толькі каханне, але і ўзаемаразуменне, дзеці, дружная сям'я. І яго трэба будаваць абодвум, а не ганяцца за прывідам незвычайнага шчасця, якое нехта для цябе забяспечыць. Аб гэтым сведчыць перш за ўсё гісторыя жыцця Марыны Астапаўны Прыходчанкі, якая шукала такога незвычайнага, не "бабскага" шчасця, не надта лічычыся ні з тымі людзьмі, з якімі была ў шлюбе, ні з тым, што разбурае сям'ю Бародкі. Але эгаісты не бываюць шчаслівымі. Марына Астапаўна, па сутнасці, сама сябе асудзіла на адзіноцтва.

Праўда, і пабудаваць шчасце не заўсёды ўдаецца, ва ўсякім разе, так хутка, як хацелася б. Бо тое ж каханне, як паказвае пісьменнік, не заўсёды бывае ўзаемным, яно авалодвае чалавекам міжвольна і не надта паддаецца вымогам розуму, прыносіць і радасць, і пакуты. Сведчанне таму – гісторыя ўзаемаадносін Наталлі Пятроўны, Сяргея Касцянка і Лемяшэвіча, Алёшы Касцянка і Раі Снягір.

Багацце фабулы як падзейнай асновы сюжэта спрыяла яго дынамічнаму разгортванню, што немалаважна ў плане ўспрыняцця твора чытачом. Апроч таго, шматлікасць і разнастайнасць адлюстраваных калізій дазваляла больш глыбока і шматгранна выявіць сутнасць жыццёвых з'яў і асоб герояў, якая праяўляецца не толькі і не столькі ў словах, колькі ва ўчынках чалавека, яго паводзінах у той ці іншай сітуацыі. Так, напрыклад, паводзіны новага дырэктара школы Лемяшэвіча сведчаць аб яго ўдумлівасці, сумленнасці і праўдзівасці, дабразычлівасці ў адносінах да людзей, што арганічна спалучаецца ў ім з прынцыповасцю, катэгарычным непрыняццем праяў амаральнасці і заўсёднай гатоўнасцю супрацьстаяць несправядлівасці.

А ў тых эпізодах рамана, у якіх паказваецца сакратар райкома партыі Арцём Захаравіч Бародка, мы бачым разумнага, энергічнага і валявога чалавека, які мае ў мінулым сапраўды немалыя заслугі. Але заўважаем і тое, што цяпер ён скіроўвае свае здольнасці і энергію галоўным чынам на ўзвелічэнне ўласнай персоны, на захаванне статуса першай асобы ў раёне, яго гаспадара, які лепш за ўсіх ведае, што і як трэба рабіць. Прынцып калектыўнасці ў кіраўніцтве для Бародкі – пустая фармальнасць. Іншадумцаў ён не церпіць і ўсяляк імкнецца пазбавіцца ад іх. Але пры ўсім тым стараецца захаваць рэпутацыю сумленнага чалавека і сапраўднага камуніста, адданага прынцыпам



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

партыйнай дэмакратыі. Таму ён і вынаходзіць для расправы з непакорнымі знешне прыстойныя падставы, не грэбуе дэмагогіяй, лёгка ладзячы з рэшткамі сумлення і не прызнаючыся ў сапраўдных матывах уласных паводзін нават самому сабе.

Так, Лемяшэвіча ён хацеў перавесці ў іншую школу нібыта з мэтай умацавання яе кіраўніцтва, а на самай справе – каб той не назаляў папрокамі ў амаральнасці, бо Бародка мае каханку – настаўніцу з Крыніц. "Занадта разумных" старшыню райвыканкома Валатовіча, раённага пракурора Кляўко ды рэдактара раённай газеты Жданко "сплаўляе" на пасады старшынь калгасаў, выкарыстаўшы ўстаноўку партыі на ўмацаванне іх кіруючага звяна. Крытыку Бародка можа ўсур'ёз успрымаць, а дакладней – мусіць цярпець, хіба што толькі з боку высокага начальства, – ды і тое толькі тады, калі апраўдвацца абсалютна нечым. Таму ён і акружае сябе такімі "кадрамі", якія, фактычна, ні на што не здатныя, але будуць усяляк дагаджаць і выканаюць, не пярэчачы, любы загад.

Гэты чалавек – жывое ўвасабленне бездухоўнасці культаўскага часу, панавання фармалізму, каманднага метаду кіраўніцтва – таго, што стала перашкодай прагрэсу грамадства і павінна было адысці ў нябыт разам са сталіншчынай. Таму падзеі, у якіх раскрываецца сапраўдная сутнасць Бародкі, складаюць фактычна самастойную сюжэтную лінію, надзвычай важную для раскрыцця зместу ўсяго твора.

Побач з тым у рамане разгортваецца цэлы шэраг сюжэтных ліній, у якіх раскрываецца маральны воблік антыподаў Бародкі, такіх, як той жа Лемяшэвіч, урач Марозава, Сяргей і Аляксей Касцянкі, стары настаўнік Даніла Платонавіч. Менавіта яны карыстаюцца ў сялчан вялікай павагай за розум, сціпласць і чалавечнасць, за самаадданую працу на карысць людзей. Нездарма Полаз называе Наталлю Пятроўну Мароз *"нашым сумленнем"* [117]. І гэта сведчыць, што ў народзе, нягледзячы на пакручастыя абставіны яго лёсу, захоўваюцца этычныя нормы жыцця, выпрацаваныя на працягу стагоддзяў.

Сюжэтныя лініі ў рамане часам перасякаюцца, узаемна дапаўняючы адна другую, і развіваюцца толькі ў той меры, якая неабходная для раскрыцця пэўнай праблемы або выяўлення сутнасці характару персанажа. Так, напрыклад, адносіны некаторых калгаснікаў да свайго становішча дастаткова выразна раскрываюцца, у прыватнасці, у тых раздзелах твора, дзе апавядаецца аб Аксінні Хвядосаўне Снягір. Вядомая на ўсю вобласць звеннявая па вырошчванню кок-сагызу, а потым ільну, дбайная гаспадыня, яна не такая і простая, як можа здацца. Як паказваецца ў сцэне пасяджання праўлення калгаса, менавіта гэтая *"хітрая і прадбачлівая"* [200] жанчына тлумачыць Лемяшэвічу тое, што ён не мог зразумець сам, – чаму такі прыбраны, ветлівы, таварыскі раптам стаў Махнач.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*"Калі адчуваў сваю сілу, дык яшчэ трымаўся. А як жа – гаспадар і ўладар! Што яму праўленне! А адчуў слабасць – і закруціўся... не пазнаць. Як артыст які..."* [197–198], – гаворыць яна. Цяпер, пасля пленума, калгаснікі цярпець такіх не будуць: *"Не было б гэтага пералому – няхай быў бы Махнач, цярпелі б як-небудзь. Але цяпер - дудкі, не сцерпім. Цяпер ведаем, што прышлюць не Патапа. А каму не хочацца лепшага?"* [201].

Здавалася б, усё проста і ясна. Але ж чаму тады сваю дачку Раісу Аксіння Хвядосаўна так настойліва стараецца "вывесці ў інтэлігенты"? Як кожная маці, яна жадае для свайго дзіцяці шчасця, светлай будучыні. Ды бачыць яе, відаць, не ў калгасе, у якім так многа залежыць ад таго, якога старшыню прышлюць "зверху". Пабыўшы замужам за райкомаўскім работнікам, а потым (пасля яго гібелі на вайне) папрацаваўшы ў калгасе, яна мела магчымасць зрабіць пэўныя вывады. Таму і спадзяецца на тое, што музычныя здольнасці выведуць Раісу ў вялікі свет – яе дачка не для калгаса. Таму, можа, і робіць усё магчымае, каб яна адвярнулася ад Алёшы Касцянка, бо калі сімпатыі перарастуць у каханне, то гэта, можа, раз і назаўсёды паставіць крыж на надзеях Аксінні Хвядосаўны. І яна, хаця і ў меншай меры, чым кватарант, завуч школы Арэшкін, але пераконвае Раісу ў яе таленавітасці, у тым, што яе чакае вялікая будучыня, чым псуе характар дзяўчыны.

Раіса не спадабалася Лемяшэвічу ўжо пры першай сустрэчы ў гасцях у Арэшкіна.

*"Не падабалася, як яна паводзіла сябе. Праўда, за сталом сядзела маўклівая і як бы засмучаная ці збянтэжаная: чырванела, калі да яе звярталіся, не ўзнімала вачэй. Але ішло гэта, як заўважыў Лемяшэвіч, не ад сціпласці, а ад какецтва, ад самалюбавання"* [48].

Гэтае меркаванне пацвердзілася, калі Раіса заспявала раманс, які ў яе выкананні "гучаў ненатуральна: Рая "крыўлялася", голас яе дрынчэў, ламаўся" [50]. Яшчэ больш яўна беспадстаўныя прэтэнзіі дзяўчыны на таленавітасць праявіліся ў яе рэакцыі на куды лепшы спеў дзяўчат з дому насупраць.

*"І раптам – злосны смех і абразлівыя словы:*

*– Трашчаць, як сарокі. Аж агідна слухаць! Фальшываць на кожнай ноце...*

*Раіса стаяла каля піяніна, ганарліва ўзняўшы галаву, але выглядала яна ў гэтую хвіліну непрыгожай: на твары выступілі пунцовыя плямы, вочкі сталі маленькія і калючыя"* [51].

Шмат чаго давядзецца перажыць гэтай увогуле някепскай дзяўчыне, перш чым яна пазбавіцца ад ілюзій, навучыцца крытычна ацэньваць і сябе, і іншых, адрозніваць шчырасць ад фальшу.

Праблема станаўлення асобы, выхавання моладзі – адна з важнейшых у рамане. Яна раскрываецца як у асобных сюжэтных лініях узаемаадносін Алёшы Касцянка і Раісы Снягір, так і ў шматлікіх сцэнах школьнага жыцця.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Пісьменнік, сам былы настаўнік, як нам уяўляецца, хацеў звярнуць увагу грамадства на тыя моманты, якія супярэчылі задачы выхавання чалавека камуністычнага грамадства, – гарманічна развітай, высокамаральнай асобы. Таму Лемяшэвіч, у прыватнасці, вырашае нанова рамантаваць школу: "<…> *пакоі так пабелены, што на столі і на сценах ад пэндзаля засталіся дзівосныя ўзоры, печы складзены няўмела і непрыгожа*" [26]. У такім інтэр'еры гаварыць пра выхаванне густу вучняў не даводзіцца. Аднак галоўнае не гэта.

Характар чалавека фарміруецца пад уплывам перш за ўсё двух важнейшых асяродкаў выхавання: сям'і і школы. А сувязь паміж імі, узгодненасць дзеянняў у многіх выпадках, можна сказаць, прывідная, эпізадычная. Да таго ж у краіне працоўных, як тады нярэдка называлі СССР, многія бацькі, ды й школа не прывучалі сваіх выхаванцаў да працы.

*"У нас шмат гавораць аб палітэхнізацыі, аб выхаванні любві да фізічнай працы... А дзе яе прывіваць, дзе вучыць дзяцей працаваць?"* [88], – пытаецца стары настаўнік Даніла Платонавіч. І адказвае на гэтае пытанне так: *"У школе, безумоўна. Хіба нельга добрую частку вось гэтага рамонту выканаць сіламі вучняў старэйшых класаў? І пад добрым кіраўніцтвам можна навучыць таму-сяму. Хто гэта выдумаў, што ў час канікулаў мы не маем права гэтага рабіць? Ці не таму ў нас палавіна вучняў цэлае лета лынды б'е. "Інтэлігентамі" зрабіліся. У некаторых школах на прышкольных участках працуюць тэхнічкі, калгасніцы, а вучні стаяць – рукі ў кішэні, як панкі, і глядзяць. Каб прывіць любоў да працы, трэба працаваць"* [88].

Праблема, заўважым, актуальная і для нашага часу.

Даніла Платонавіч, безумоўна, правы, калі гаворыць, што трэба змалку прывучаць людзей да працы, што старэйшыя павінны вучыць іх выконваць сур'ёзную, патрэбную работу. Гэтая думка ў рамане раскрываецца праз цэлую сістэму вобразаў: Алёшы і Сяргея Касцянкоў, Лемяшэвіча і вучняў школы. Сяргей Касцянок, механік МТС, дапамог авалодаць тэхнікай свайму малодшаму брату Аляксею. І той, будучы яшчэ старшакласнікам, у час жніва працуе камбайнёрам, нават выходзіць у перадавікі ў раёне. Пры гэтым ён застаецца такім жа сціплым, як і быў, бо для яго важная сама справа, а не слава. Нічога надзвычайнага ў сваёй працы ён не бачыць. Таму і адмаўляецца падпісваць "арганізаваны" Бародкам зварот да механізатараў раёна з заклікам да спаборніцтва і так няёмка адчувае сябе, калі яго аднакласнікі ці дарослыя пачынаюць хваліць яго за працоўны гераізм.

Той жа Сяргей Касцянок адыгрывае немалую ролю ў працоўным выхаванні і іншых вучняў Крыніцкай школы. Ён арганізуе работу аўтатрактарнага гуртка, дзе старшакласнікі захоплена і ўсур'ёз займаюцца вывучэннем і рамонтам сельгастэхнікі, набываючы рэальную прафесію. Гэта для іх куды важней і цікавей, чым выраб нікому не патрэбных прымітыўных рэчаў, чым

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

у большасці выпадкаў займаліся вучні ў школьных майстэрнях. Тут яны прыносяць рэальную карысць і сабе, і МТС, кіраўніцтва якой нават вырашае аплачваць іх працу. Фактычна, пісьменнік ставіць пытанне аб неабходнасці на справе, а не толькі на словах, пераходзіць да палітэхнізацыі ў навучанні, аб арыентацыі яго на прафесійную падрыхтоўку старшых школьнікаў, і, апроч таго, аб аплаце іх працы.

Яшчэ адна бяда, на якую звяртае ўвагу пісьменнік, – тое, што ў школах сустракаюцца "настаўнікі" тыпу завуча Арэшкіна. Не будзем ўжо гаварыць пра яго ўплыў на Раю, пра пакінутых ім жанчын – тут каментарыі, думаецца, залішнія. Ён – амаральны чалавек. Звернем, аднак, увагу і на яшчэ адну акалічнасць: Арэшкін, як і Махнач, "духоўны двайнік" Бародкі, толькі хіба драбнейшага маштабу. Як Махнач баіцца толькі Бародкі, а Бародка – вышэйшага за яго начальства, так і Арэшкін не асмельваецца занадта адкрыта выступаць супраць дырэктара школы. Хаця быў бы не супраць і "зваліць" яго ды стаць першай асобай у школе. Нават спрабуе інтрыгаваць, папракае настаўніцу Прыходчанку, каханку Бародкі, за тое, што яна дабраахвотна ўзялася весці харавы гурток.

*"Ножку мне падставілі, захацелі добранькай быць. А перад кім? А? Ён вас гразёй аблівае, пад Арцёма Захаравіча, пад вашу дружбу падкопваецца. А вы!.. Эх, вы!.. Зразумейце, калі мы будзем так дзейнічаць, ён нас усіх сагне ў рог і не аднаго гэтага старога перацягне на свой бок... А хто ён такі? А? Вы, я, Кавальчукі, Лапіч – мы аснова калектыву, і мы павінны..."* [186].

Аднак, зразумеўшы, што нічога не атрымаецца, Арэшкін мусіць задавальняцца ўладай над вучнямі. Вучні для яго – тое ж, што калгаснікі для Махнача або падначаленыя для Бародкі, – "вінцікі", якія павінны выконваць вызначаную ім функцыю. Для Арэшкіна важна перш за ўсё захаванне формы, знешні антураж. Пачалі дзесяцікласнікі ў класе падкідваць Алёшу Касцянка за працоўны гераізм "на ура" – тут жа яго ў настаўніцкую, як парушальніка дысцыпліны.

*– Калі ласка, палюбуйцеся на гэтага героя, які ўчыніў у класе Мамаева пабоішча! А? Як вам падабаецца? – пераможна і зларадасна пытаў Арэшкін"* [158].

*"Па-вашаму, няхай становяцца на галовы? Няхай ламаюць, б'юць? Так мы ўмацоўваем дысцыпліну! А? Вы самі парушаеце яе! Вы заступаецеся за сваяка! Таварыш дырэктар! Я прашу падтрымаць мяне... Гэта старая гісторыя!"* [158], – гаворыць ён, калі, даведаўшыся, што было на самай справе, Даніла Платонавіч адпраўляе Алёшу ў клас.

Словы Арэшкіна – суцэльная дэмагогія. Па сутнасці, ён, як і Бародка, стараецца прынізіць падначаленых яму настаўніка і вучня, што маюць сваю думку, адважваюцца пярэчыць – і Алёшу, і Данілу Платонавіча. Арэшкін



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

будзе рабіць гэта любымі даступнымі спосабамі, як і той жа Бародка, прыкрываючы ўласную подласць знешняй аб'ектыўнасцю.

Але, як сцвярджае І. Шамякін, час такіх Барадак, Махначоў ды Арэшкіных мінуўся. Людзі не хочуць больш цярпець ні іх, ні тых парадкаў, якія былі раней, і перастаюць маўчаць. Арэшкіна вызваляюць ад пасады завуча, а пасля скандальнай гісторыі з Ядзяй Шачкоўскай ён наогул мусіць з'ехаць з вёскі. Ды на гэты раз змена месца працы, відаць, не дапаможа яму, як раней, замаскіраваць сваю сапраўдную сутнасць. Настаўнікі вырашылі паведаміць у тую школу, куды перавёўся Арэшкін, пра ўсе яго "подзвігі". Калгаснікі выбіраюць новага старшыню замест Махнача, а камуністы раёна "пракацілі" на раённай партканферэнцыі кандыдатуру Бародкі. Гэта – кульмінацыйныя моманты ў сюжэце рамана, у якіх знаходзіць сваё вырашэнне асноўны канфлікт рэчаіснасці ў яго быційным і маральным аспектах. Пераадольваецца разрыў паміж словам і справай, паміж праклямуемым клопатам аб чалавеку, гуманістычнай па сваёй сутнасці ідэяй сацыялістычнага ладу і рэальным становішчам спраў.

І. Шамякін паказвае, што пэўныя праявы перажыткаў мінулага яшчэ сустракаюцца, але галоўная тэндэнцыя ў развіцці грамадства выразна выявілася і ўсё больш набірае сілу. Гэтая ідэя раскрываецца праз вобразную сістэму і сюжэт як сістэму дзеяння ў творы. Аднак не меншае значэнне для раскрыцця яго зместу мае і кампазіцыя, якая афармляе дзеянне і наогул структурна арганізоўвае матэрыял, абляпчаючы яго ўспрыманне і разуменне чытачом.

Варта адзначыць, што І. Шамякін праявіў вялікае майстэрства ў пабудове як сюжэта, так і кампазіцыі. Адкрыта аўтарская пазіцыя выяўляецца толькі ў нешматлікіх адступленнях публіцыстычнага характару. Асноўным жа спосабам "знітавання" і арганізацыі матэрыялу пісьменнік абірае апавяданне "ўсёзнаючага" аўтара, чым у многім дасягаецца ілюзія бесстаронняга адлюстравання рэчаіснасці. Асноўная нагрузка ў раскрыцці зместу твора кладзецца на вобразы герояў і персанажаў. Паказваючы іх паводзіны, перажыванні ў жыццёва праўдападобных сітуацыях, у сутыкненнях са сваімі антыподамі, пісьменнік дае магчымасць чытачу ацаніць сацыяльную сутнасць і духоўны патэнцыял прадстаўнікоў розных тыпаў людзей, пакрысе падводзячы да разумення ідэі рамана. Уласна кажучы, у "Крыніцах" на гэта працуе перш за ўсё супрацьпастаўленне тых, хто сапраўды жыве з людзьмі і для людзей, такіх, як Марозава, Лемяшэвіч, Даніла Платонавіч, і тых, хто толькі прыкідваецца такім, а жыве для сябе.

Шматлікасць герояў і персанажаў, розніца ў значэнні іх вобразаў для разумення зместу твора чытачом, відаць, абумовілі неабходнасць вылучэння пісьменнікам асобных сюжэтных ліній і своеасаблівага кампазіцыйнага цэнтра – вобраза Лемяшэвіча. Наўрад ці можна гаварыць аб ім як аб галоўным



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

герої. На першы план у рамане ён выходзіць не ў сілу якіх-небудзь выключных якасцей сваёй асобы, а менавіта як чалавек, абставіны жыцця якога абумоўліваюць яго дачыненне да многіх людзей і падзей, што ў пэўнай ступені спрашчае задачу арганізацыі ўсяго матэрыялу. Фактычна, апавяданне аб жыцці Лемяшэвіча ў Крыніцах было тым стрыжнем, на якім трымалася храналагічная паслядоўнасць у паказе ўсёй адлюстраванай у рамане рэчаіснасці. Эпізоды з жыцця Лемяшэвіча перамяжоўваюцца ў рамане з апісаннем падзей, якія адбываюцца ў гэты ж час у другіх месцах і з другімі людзьмі. Такім чынам дасягаецца і дынамічнасць развіцця сюжэта, і аблягчаецца ўспрыняцце твора чытачом.

Храналагічная паслядоўнасць парушаецца толькі ў тых выпадках, калі адчуваецца патрэба ў больш глыбокім раскрыцці вобраза. Тады пісьменнік звяртаецца да рэтраспекцыі, чым дасягаецца і пэўнае пашырэнне сюжэта. Бо, напрыклад, не ведаючы ад аўтара твора, як працавала ўрач Марозава ў Крыніцах пасля іх вызвалення, чытачу цяжка было б зразумець, чаму яе так паважаюць і любяць людзі. Згадка Лемяшэвіча аб тым, як дапамаглі партызанам ў час блакады Даніла Платонавіч і яго сябра, істотна дапаўняе ўяўленне чытача аб старым настаўніку, не кажучы ўжо, што матывуе даверлівыя адносіны Данілы Платонавіча да Лемяшэвіча.

Успамін жа самога Лемяшэвіча аб сваім жыцці да прыезду ў Крыніцы, з аднаго боку, вырашаў чыста кампазіцыйную задачу: матываваць знаёмства Лемяшэвіча з Жураўскімі, а праз тое – і прыезд менавіта ў Крыніцы, усталяванне сувязей з сям'ёй Касцянкоў. З другога боку, гэтая рэтраспекцыя многае праясняе і ў характары самога Лемяшэвіча. У прыватнасці, і прычыну таго, што маючы рэальныя шанцы абараніць дысертацыю, ён не стаў гэтага рабіць. Напрыканцы работы над ёй Лемяшэвіч засумняваўся ў практычнай карысці зробленага.

*"Каму патрэбны яго аналіз грамадскай работы ў сярэдняй школе, якая афіцыйна лічылася лепшай, але ў якой работа гэтая была такая ж сухая і сумная, як і ў некаторых іншых школах?"* [30]

Гэта сведчыць аб сумленнасці героя твора, яго патрабавальнасці да сябе.

Для раскрыцця характараў персанажаў рамана пісьменнік звяртаецца да самых розных кампазіцыйных сродкаў і прыёмаў: апісання, замалёўкі, маналогу і дыялогу, няўласна-простай мовы, выяўлення знешніх прыкмет псіхалагічнага стану чалавека, аўтарскіх адступленняў і характарыстык. Але выкарыстоўваюцца яны ў рознай меры, што тлумачыцца перавагай у творы прамой формы псіхалагічнага аналізу. Для такой формы псіхалагічнага аналізу характэрна раскрыццё ўнутранага свету героя не толькі праз паказ яго паводзін, словы, але і непасрэдную фіксацыю яго думак і перажыванняў "усёведаючым" аўтарам.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вось, як, напрыклад, паказвае І. Шамякін перажыванні Бародкі перад пачаткам партыйнай канферэнцыі.

*"У кабінет ускочыў Шапавалаў, які быў цяпер за памочніка сакратара.*

*– Арцём Захаравіч, Малашанка прыехаў, – таямнічым паўшэптам паведаміў ён.*

*Шапавалаў ад дзвярэй не бачыў Валатовіча, які ўсё яшчэ грэўся каля грубкі.*

*Бародка неяк унутрана ўстрапянуўся, але тут жа, успомніўшы пра Валатовіча, зрабіў выгляд, што аб прыездзе на канферэнцыю сакратара абкома ён ведаў раней. У сапраўднасці ж рэакцыя яго была зусім іншая. Ён ведаў, што на канферэнцыю да іх павінен быў прыехаць загадчык аддзела прапаганды, і гэтая акалічнасць супакойвала: не едзе ніхто з сакратароў – значыцца, сур'ёзных змен не будзе, значыцца, у ім упэўнены па-ранейшаму. І раптам – Малашанка, якога пасля ўсёй гісторыі з пераводам Лемяшэвіча і асабліва пасля пасяджэння бюро абкома ён, Бародка, больш не лічыў за сябра, не любіў і баяўся. Чаму прыехаў Малашанка? Што здарылася? Гэта моцна ўстрывожыла яго. Але ён нічым не выявіў сваёй устрывожанасці. Абыякава спытаў у Шапавалава:*

*– І дзе яно, начальства?*

*– Было тут, Арцём Захаравіч, потым пайшло вас шукаць, ды яго Алена Сямёнаўна сустрэла і на кватэру павяла.*

*– Добра, – сказаў Бародка, даючы зразумець Шапавалаву, што больш ад яго нічога не патрабуецца"* [321].

Як нам уяўляецца, такая форма псіхалагічнага аналізу ў дадзеным выпадку і была найбольш прыдатнай для выяўлення сацыяльнага зместу рамана і раскрыцця характараў герояў – людзей грамадскіх і па пасадах, і па прафесіях, і па сваёй сутнасці. У сферы іх інтарэсаў найперш актуальныя праблемы жыцця народа – і развіццё сельскай гаспадаркі, і метады партыйнага кіраўніцтва, і безліч іншых. Таму дыялог і непасрэднае ўказанне ў аўтарскім апавяданні на перажыванні герояў з'яўляецца асноўным кампазіцыйным сродкам раскрыцця іх характараў.

Праз непасрэднае ўказанне на перажыванні персанажа пісьменнік раскрывае і пачуцці Марыны Астапаўны, калі яна здагадалася аб тым, чаму раніцай Наталля Пятроўна выходзіла з кватэры Лемяшэвіча.

*"У яе дзіўна заблішчэлі вочы – ад радасці, што нават такая жанчына, якую лічылі ледзь не за святую, аказалася звычайнай смяротнай грэшніцай, як і ўсе, і ад пачуцця рэўнасці – хоць яна ні на што не спадзявалася, але Лемяшэвіч падабаўся ёй усё больш і больш. Магчыма, з-за яго яна парвала з Бародкам, перад ім адным яна адчувала сябе сарамлівай дзяўчынай – пасля першай размовы аб кватэры больш ніколі не адважвалася нават*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*непрыстойна пажартаваць ці выявіць сваю сімпатыю. Такія пачуцці для яе былі незвычайнымі і прыемнымі. У яе зноў з'яўляліся мары пра нейкае асаблівае шчасце. І вось – усяму гэтаму канец. Яшчэ адно расчараванне. Яна ўмомант стала злоснай, з'едлівай, гатовай з усяго і ўсіх здзекавацца"* [321].

Гэтыя заўвагі аўтара многае праясняюць у характары Марыны Астапаўны. Яна не здатная любіць другога больш, чым сябе.

Іншы раз перажыванні герояў раскрываюцца праз апісанне іх сноў. Пасля першай сустрэчы з Наталляй Пятроўнай Лемяшэвіч бачыць яе ў сне.

*"І зноў перад вачамі – Наталля Пятроўна, але глядзіць яна ўжо не зняважліва, а жаласліва, нібы ёй вельмі шкада яго, бездапаможнага, пакрыўджанага. Міхась узлаваўся:*

*"Чаго ты прычапілася да мяне? Я цябе ведаць не жадаю і знаёміцца не хачу".*

*"Ты наша сумленне, Наташа!" Якое ты маё сумленне? Маё сумленне ў мяне, я нікому не аддам яго... І больш піць не буду! Больш мяне не падманіце! Не! Вось і ўсё!"* [118]

Па сутнасці, тут выяўляецца яшчэ не ўсвядомленае самім Лемяшэвічам пачуццё да гэтай жанчыны, якому ён спрабуе неяк супраціўляцца.

Гэтак жа ў сне да Наталлі Пятроўны прыходзіць яснае разуменне таго, што яна кахае Лемяшэвіча.

*"Прыемная стома разлілася па целе – стома чалавека, які сумленна папрацаваў і мае поўнае права адпачыць. Хораша на душы, лёгка, светла! Здаецца, што ніколі яшчэ яна не адчувала такой радасці, такога шчасця ад таго, што не пусціла гора ў людскую хату, што перамагла бязлітасную і страшную сілу – смерць. "Так, гэта – шчасце, шчасце не толькі Насціна, Клімава, Гальчына, але і маё! Каб заўсёды было так лёгка, так радасна... Каб не ведаць трывог... неспакою". - Яна схамянулася, бо зноў убачыла перад сабой Міхася Кірылавіча з яго позіркам. "Што ты хочаш ад мяне? Навошта так глядзіш на мяне? З любоўю і нянавісцю... Цябе абурае, што мяне так сватаюць? Добра, я прызнаюся: я кахаю цябе. Божа мой! Што я кажу!" – Яна спалохана ўзняла галаву і глянула на шырокую спіну Кліма – ці не пачуў ён яе думак?"* [365]

І гэтае нечаканае для самой сябе прызнанне Наталлі Пятроўны вызначае яе далейшыя паводзіны.

Такія кампазіцыйныя прыёмы выяўлення настрою персанажаў, як маналог героя, апісанне, пейзаж у рамане "Крыніцы" выкарыстоўваюцца рэдка. Аднак яны з'яўляюцца важнымі элементамі мастацкай структуры твора. Яскравае сведчанне таму – маналог Данілы Платонавіча ў эпізодзе наведвання яго вучнямі пасля выпускных экзаменаў у школе. Наказ, які дае стары настаўнік сваім вучням, што выходзяць на шлях самастойнага жыцця, мае



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вялікае значэнне для раскрыцця не толькі характару самога Данілы Платонавіча, але і галоўнай ідэі ўсяго твора.

Немалаважнае значэнне для выяўлення погляду пісьменніка на праблему шчасця мае і маналог Марыны Астапаўны Прыходчанкі ў эпізодзе прыезду да яе Бародкі пасля парткамферэнцыі. Тут, у гэты час яна зразумела, што надзея на шчасце з гэтым чалавекам была марная, бо для яго важней не яна, а пасада, сям'я, дзеці.

*"На што я спадзявалася? На шчасце? На якое? На крадзенае шчасце? Не, больш я не хачу крадзенага шчасця! Якое гэта шчасце! Божа мой! Каб мне дзіця! <...> "* [344].

Расчараваўшыся ў Бародку, разважаючы над сваім лёсам, Марына Астапаўна гаворыць: *"Вунь нават Сухава, і тая шчаслівей за мяне... У яе памёр муж, але ў яе дачка... Харошанькая такая дзяўчынка!.. Беленькая, вочкі блакітныя... цэлы дзень звініць, ажно ў хаце павесялела, быццам вясна прыйшла... <...> Калі мяне пакінуў першы муж, я страшна перажывала, але не разумела яго тады, а цяпер разумею. Мне было дваццаць тры, а яму трыццаць, яму вельмі хацелася мець дзіця"* [344].

Па сутнасці, Марына Астапаўна, відаць, мела магчымасць быць шчаслівай, ды страціла яе з-за ўласнага эгаізму.

Разам з тым даволі шырока выкарыстоўваюцца І. Шамякіным і выяўленчыя магчымасці ўскоснай формы псіхалагізму: аб'ектыванае апавяданне, пры якім характар, унутраны стан героя выяўляецца галоўным чынам праз знешнія прыкметы. Напрыклад, увішнасць і гаспадарлівасць старожкі школы выяўляецца ў тым, што яна, ідучы да настаўніцкай, *"<...> па дарозе хутка падмяла на ганку кватэры, прыбрала са сцежкі аполак, цераз які яны з Арэшкіным двойчы пераступілі, выцерла пыл з лаўкі і зрабіла яшчэ некалькі спраў і ўсё гэта ў такім тэмпе, што ні хвіліны не прымусіла Лемяшэвіча чакаць"* [40].

А вось як малюецца пісьменнікам сцэна знаёмства Лемяшэвіча з Бушылам.

*"– Бушыла. Настаўнік, які павінен будзе вам падпарадкоўвацца, таварыш новы дырэктар.*

*– А-а, – міжволі вырвалася ў Лемяшэвіча, пасля чаго ён назваў сваё прозвішча і спытаў: – А што вы тут робіце?*

*– Чаму – "а-а"? – дзёрзка спытаў Бушыла. – Вам гаварылі пра мяне? Арэшкін?*

*– Не, раней. У Мінску.*

*Бушыла коратка рагатнуў.*

*– Го-хо...Я і не ведаў, што я такі славуты, што і ў Мінску мяне ведаюць. Хто?*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*– Дар'я Сцяпанаўна.*

*– А-а, – у сваю чаргу працягнуў ён і ні слова не сказаў пра швагерку ці яе мужа"* [42].

У гэтым кароткім дыялогу даволі выразна выяўляюцца істотныя рысы характару Бушылы: яго няўрымслівасць, непасрэднасць, гарачнасць, часта залішняя. Ужо ў тым, як ён адрэкамендаваўся, схаваны пэўны падтэкст – павінны буду падпарадкоўвацца, але буду ці не – гэта будзе залежыць ад таго, што ты за чалавек. Бурная рэакцыя на "а-а" Лемяшэвіча выклікана падазрэннем, што Арэшкін, якога Бушыла цярпець не можа, відаць ужо "аб'ектыўна ахарактарызаваў" сваіх калег новаму дырэктару. А вось "а-а" самога Бушылы, калі ён даведаўся, хто расказваў пра яго, азначае не толькі тое, што ён зразумеў беспадстаўнасць сваіх меркаванняў. Гэта і выяўленне змены адносін да Лемяшэвіча з падазронасці на прыязнасць. Бо, як гаворыцца, скажы, хто твой сябра, і я скажу, хто ты. А што яго швагерка чалавек вельмі прыстойны, Бушыла добра ведае.

Праз знешнія прыкметы пачуццяў персанажаў – жэст, погляд, выраз твару – перадаецца, напрыклад, псіхалагічная напружанасць моманту, калі члены бюро райкома галасуюць супраць прапановы Бародкі аб пераводзе Лемяшэвіча ў Ліпняцкую школу.

*"Бародка сам узняў руку і чакаў, пільна сочачы за кожным з членаў бюро, кідаючы ім позіркі, у якіх былі і чаканне, і загад, і стоены гнеў. Ні адной рукі больш не паднялося. Члены бюро не глядзелі на яго. Яны сядзелі, унурыўшы галовы, быццам саромеліся, і займаліся хто чым: другі сакратар Птушкін, на якога асабліва пільна глядзеў Бародка, хутка распісваўся на чыстым аркушы паперы, употай пазіраючы на другіх – ці галасуе хто яшчэ? Рэдактар шчоўкаў замком сваёй прыгожай зялёнай папкі. Валатовіч, праціраючы акуляры, дакорліва ківаў галавой. І толькі Кляўкоў, дэманстратыўна глянуўшы на гадзіннік, сказаў:*

*– Я галасую супраць.*

*Пасля яго слоў Бародка хутка апусціў сваю руку і схаваў яе пад стол.*

*– Так, – знешне спакойна сказаў ён і звярнуўся да Лемяшэвіча: – Можаце ісці... і працуйце пакуль што..."* [169].

Для Бародкі галасаванне – апошні шанц правесці патрэбнае яму рашэнне, з якім не пагаджаюцца члены бюро. Ён яшчэ спадзяецца, што там, дзе не спрацоўваюць яго довады, спрацуе аўтарытэт яго пасады, прывычка падначаленых да дысцыпліны. Аднак памыляецца – яны, хаця і адчуваюць сябе неяк няёмка, не падтрымліваюць Бародку, а раённы пракурор дык і дэманстратыўна заяўляе аб сваёй нязгодзе. Бародка церпіць фіяска, аднак застаецца знешне спакойным. Як відаць, ён усё ж спадзяецца, што здолее рана ці позна дабіцца свайго, таму і кажа Лемяшэвічу тое "працуйце пакуль што".



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Бародка не разумее, што сталінская эпоха мінулася, людзі перасталі баяцца выказаць уласную думку. Ён яшчэ спрабуе павярнуць ход падзей у прывычную каляіну, але зноў церпіць паражэнне.

*"Так, таварышы... Так, – сказаў ён з доўгімі паўзамі і як бы з жалем за ўсё, што здарылася, і раптам злосна спытаў: – Як жа будзем працаваць далей, га?*

*Ніхто не адказваў.*

*– Як можна працаваць, калі ў бюро такі разлад?.. Анархія! Калі прапановам першага сакратара – нуль увагі?!* <...> *Як я магу кіраваць раёнам, калі члены бюро...*

*– Арцём Захаравіч! – зноў-такі спакойна і далікатна перапыніў яго Валатовіч. – Кожны з нас, у тым ліку і ты, можа памыляцца... Думка калектыву – яна заўсёды самая правільная! І калі бюро не пагадзілася з табой...*

*– Не! – крыкнуў Бародка, як гаўкнуў, і закашляўся. – Гэта дэманстрацыя! Змова! І ўсё гэта – твая справа, таварыш Валатовіч! Я ведаю! І я гэта так не пакіну!.. Я пастаўлю на сваё месца і гэтага ... дырэктара, і яшчэ каго-небудзь...*

*– Ну, ведаеш, – Валатовіч энергічным рухам адсунуў ад сябе попельніцу, паперы. – Не аднаму табе вядома, чаму ты хочаш выжыць Лемяшэвіча з Крыніц. Вось так. І не крычы, калі ласка. Не палохай. Вядзі пасяджэнне. Людзі чакаюць"* [170–171].

Неадпаведнасць чалавечых якасцей, метадаў кіраўніцтва Бародкі запатрабаванням новай эпохі і становяцца галоўнай прычынай яго краху і як кіраўніка, і як асобы.

Нямала ў рамане і эпізадычных персанажаў, у апавяданні аб паводзінах якіх, знешне абсалютна бестароннім, раскрываюцца адносіны аўтара да асобных з'яў рэчаіснасці. Так, стаўленне радавых працаўнікоў да рознага роду штурхачоў-упаўнаважаных выразна выяўляецца ў эпізодзе размовы Лемяшэвіча з шафёрам машыны, на якой ён дабіраўся да Крыніц.

*"– Колькі з мяне? – спытаў Лемяшэвіч, дастаючы з кішэні кашалёк.*

*– Чацвяртак, – адразу адказаў шафёр, ляснуўшы далонямі і пацёршы імі як бы ад задавальнення, што атрымае такую суму.*

*– Дваццаць пяць рублёў? – здзівіўся Лемяшэвіч. – Па рублю за кіламетр? Нішто! Гэта вы так з усіх лупіце?*

*– Не-э... Толькі з упаўнаважаных. Яны камандзіровачныя атрымліваюць... – Цяпер ужо хлопец стаяў насупраць, з цікавасцю разглядаў свайго пасажыра, і ў карых, па-дзіцячаму ясных вачах яго скакалі агеньчыкі жартаўлівага смеху.*

*– Паўлік, а, можа, гэта і не ўпаўнаважаны. Можа настаўнік, – адгукнулася з кузава гаманкая жанчына. – Зараз яны з'язджаюцца хто адкуль.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*– Настаўнік? – хутка спытаў Паўлік, перапыніўшы старую.*

*– Настаўнік, – усміхнуўся Лемяшэвіч.*

*– Тады ганіце пяць карбаванцаў"* [170].

Мастацкі вопыт, набыты ў час працы над папярэднімі творамі, дазваляў І. Шамякіну лягчэй знаходзіць аптымальныя рашэнні ў плане выкарыстання кампазіцыйных сродкаў і прыёмаў раскрыцця зместу рамана "Крыніцы". Пісаўся ён, як успамінаў пазней яго аўтар, *"<...> лёгка, добра. Школа, – што я нядаўна перажыў. А, можа, найперш – адчуванне свабоды, раскаванасці. Ды і ўпэўненасці ў сваіх магчымасцях было больш – трэці раман. Друкаваў урыўкі. Але Бародку не выводзіў на свет белы. <...> Усё яшчэ баяўся?"*[14].

Што ж, калі не баяцца, то асцерагацца на тым часе было чаго. Нават пасля XX з'езду далёка не ўсе з прадстаўнікоў улад былі ў захапленні ад таго, якім быў паказаны ў рамане сакратар райкома партыі Бародка. З'явіўся рэзка адмоўны водгук на "Крыніцы" сакратара райкома партыі з Віцебшчыны В. Буробіна, надрукаваны да таго ж не дзе-небудзь, а ў органе Цэнтральнага Камітэта кампартыі Беларусі, часопісе "Камуніст Беларусі"[15]. Гэта азначала, што пазіцыю В. Буробіна падзяляе партыйнае кіраўніцтва рэспублікі, і пісьменніку, магчыма, давядзецца адказваць за "ідэйныя заганы", дапушчаныя ў творы.

Поўнасцю "Крыніцы" былі ўпершыню апублікаваныя неўзабаве пасля XX з'езду КПСС, у красавіцкім і майскім нумарах часопіса "Полымя" за 1956 год. І адразу прыцягнулі пільную ўвагу літаратараў, крытыкі і масавага чытача. Яшчэ ў пачатку мая, да выхаду ў свет часопіса з заканчэннем рамана, адбылося яго абмеркаванне на пасяджэнні секцыі прозы Саюза пісьменнікаў БССР, якую тады ўзначальваў Я. Брыль. Як адзначаў Т. Хадкевіч, твор "выклікаў вельмі ажыўленую творчую дыскусію"[16]. У ёй прынялі ўдзел Я. Брыль, П. Васілеўскі, А. Вялюгін, І. Гурскі, У. Карпаў, А. Кулакоўскі, М. Паслядовіч, М. Ткачоў, Т. Хадкевіч, У. Юрэвіч[17]. Яны ў цэлым высока ацанілі "Крыніцы", адзначылі, што гэта – "з'ява новая і цікавая ў беларускай прозе, сведчанне далейшага творчага росту І. Шамякіна"[18]. Былі зробленыя і пэўныя заўвагі, якія І. Шамякін абяцаў улічыць пры выданні рамана асобнай кнігай[19].

Не засталася незаўважанай першая публікацыя "Крыніц" і літаратурнай крытыкай. Абмеркаванне было даволі бурным: на старонках штотыднёвіка

---

[14] *Шамякін, І.* Роздум на апошнім перагоне... – С. 246.

[15] Тамсама. – С. 246.

[16] *Хадкевіч, Т.* Ці такой павінна быць крытыка? / Т. Хадкевіч // Літаратура і мастацтва. – 1956. – 7 ліп. – С. 3.

[17] Абмеркаванне рамана "Крыніцы"// Літаратура і мастацтва. – 1956. – 5 мая. – С. 4.

[18] *Хадкевіч, Т.* Ці такой павінна быць крытыка?.. – С. 3.

[19] Абмеркаванне рамана "Крыніцы"... – С. 4.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"Літаратура і мастацтва" разгарнулася цэлая дыскусія. Пачалася яна з апублікаванай 30 чэрвеня таго ж года вялікай рэцэнзіі А. Адамовіча "Крыніцы б'юць з глыбінь"[20]. Крытык слушна гаварыў пра наяўнасць вострага пачуцця сучаснасці ў І. Шамякіна і адзначаў, што *"сэнс сённяшняга грамадскага жыцця аўтар рамана бачыць у змаганні за сумленнае і самаадданае служэнне савецкаму народу супраць казёншчыны, бюракратызму, культу асобы"*[21]. Высока ацаніў А.Адамовіч і тое, што І. Шамякін *"адзін з першых адчуў патрэбу ў творах, у якіх інтэлектуальны свет, жыццё савецкага інтэлігента раскрываліся б у сувязі з сур'ёзнымі, сапраўды значнымі праблемамі"*[22]. Як пра несумненна дадатныя якасці таленту пісьменніка, гаварыў А. Адамовіч пра ўменне І. Шамякіна цікава весці апавяданне, вельмі натуральна перакрыжаваць шляхі персанажаў: *"героі ў яго цесна звязаны ўзаемнымі сімпатыямі ці антыпатыямі"*[23].

*"І. Шамякін умее ўбачыць людзей з прыгожай душою, цікава паказаць іх чытачу, ярка падаць і тыя адмоўныя з'явы, што засмечваюць чыстыя крыніцы нашага жыцця"*[24], – пісаў А. Адамовіч. Але разам з тым раман бачыўся яму ілюстрацыйным, павярхоўным.

*"Іван Шамякін не робіць сур'ёзнай спробы даць праўдзівую карціну жыцця тых "паўсотні тысяч людзей", якія на сабе адчулі "стыль кіраўніцтва" Бародкі і Махнача, а таму ўсе спрэчкі Валатовіча з Бародкам аб гэтым стылі, як і многае іншае ў творы, – толькі павярхоўная ілюстрацыя да тых важных праблем, якія чытачу вядомы па газетах і з адпаведных пастаноў"*[25], – сцвярджаў крытык. На яго погляд, і вобраз Бародкі, праз які *"аўтар імкнецца выявіць свае адносіны да той грамадскай з'явы, якая атрымала назву "культу асобы"*, застаўся недапісаным, і *"іменна таму, што жыццё народа не стала ў цэнтры твора"*[26].

А. Адамовіч сцвярджаў, што *"аўтар спяшаўся кожную новую праблему, якую ўздымалі газеты, кожную новую пастанову "на хаду" ўключыць у твор, "дагрузіўшы" сюжэт новым вобразам, сцэнкай, а часам і проста выпадковым дыялогам"*[27]. Крытык выказваў меркаванне, што "Крыніцы" наогул сюжэтна не завершаны, а паказ і ацэнка дзейнасці Бародкі падмяняецца маралізатарствам…

---

[20] *Адамовіч* , *А.* Крыніцы б'юць з глыбінь… / А. Адамовіч // Літаратура і мастацтва. – 1956. – 30 чэрв. – С. 3.

[21] Тамсама.

[22] Тамсама.

[23] Тамсама.

[24] Тамсама.

[25] Тамсама.

[26] Тамсама.

[27] Тамсама.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Думаецца, што ў значнай меры папрокі А. Адамовіча былі, скажам так, не зусім абгрунтаванымі. Па-першае, ён парушаў вядомы прынцып гістарызму, згодна якому кожная з'ява павінна разглядацца ў кантэксце часу свайго ўзнікнення. Але А. Адамовіч зыходзіў з пазіцый часоў, якія пачаліся пасля нядаўняга XX з'езду, і, магчыма, пад уздзеяннем выкліканай ім пэўнай эйфарыі ў поглядах на будучыню. Планка патрабаванняў да беларускай савецкай літаратуры была паднятая крытыкам на ўзровень, які стаў дасягальным для яе хіба што ў другой палове 80-х гадоў, у часы перабудовы. Раман жа пісаўся не пасля, а да XX з'езду КПСС, калі рашучы адыход ад сталіншчыны толькі намячаўся і калі ўся праўда аб становішчы сялянства была для мастакоў слова своеасаблівай забароненай зонай.

Безумоўна, канкрэтная абстаноўка той пары не магла нейкім чынам не ўплываць на аўтара "Крыніц". Партыя, вядома, і пры І.В.Сталіне заклікала мастакоў слова *"разоблачать и беспощадно бичевать пережитки капитализма, проявления политической беспечности, бюрократизма, косности, подхалимства, чванства, кичливости и зазнайства, рвачества, недобросовестного отношения к порученному делу, небрежного отношения к социалистической собственности, разоблачать все пошлое и отсталое, мешающее движению советского общества вперед"*[28]. Ведалі, аднак, творцы, як іншы раз ацэньваецца паказ адмоўнага ў жыцці першай у свеце сацыялістычнай краіны, што пракладае чалавецтву шлях да светлай будучыні. І сам І. Шамякін ужо меў пэўны горкі вопыт: у адной з рэцэнзій на раман "У добры час" яго абвінавацілі ў *"ачарненні калгаснай вёскі"*[29]. Можа, таму ў "Крыніцах" пісьменнік і не стаў акцэнтаваць без асаблівай патрэбы ўвагу на "заможным жыцці калгаснага сялянства", дастаткова яскрава выявіўшы ўзровень яго дабрабыту праз асобныя дэталі побыту, выказванні літаратурных герояў.

Так, у рамане на стале ў вяскоўцаў, на першы погляд, дастатак. Але ў якіх іменна вяскоўцаў? У "грымеўшай" на ўсю вобласць звеннявой па ільну Аксінні Снягір, на звяно якой, па словах Валатовіча, *"працаваў увесь калгас"* [277]? А яна ж атрымлівае, апроч заробку, вельмі неблагую пенсію за загінуўшага ў вайну мужа, – маёра, былога партыйнага работніка. Дастатак на стале і ў сям'і Касцянкоў, у складзе якой – калгасны брыгадзір, інжынер МТС, настаўнік. Пра тое ж, як жывуць іншыя сяльчане, гаворыцца як быццам бы мелькам. Ды наўрад ці мог тагачасны чытач не звярнуць увагі, напрыклад, на такія словы парторга калгаса Андрэя Полаза.

*"Прыйшла да мяне сёння дэлегацыя калгаснікаў з чацвёртай брыгады, з Задуб'я... Барадачы ўсе. І чаго ты думаеш, прыйшлі? Параіцца... Прынеслі*

---

[28] Преодолеть отставание драматургии // Правда. – 1952. – 7 апр. – С. 2–3.
[29] *Шамякін, І.* Начныя ўспаміны... – С. 38.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*калектыўнае пісьмо ў ЦК... Дзякуюць за новы закон аб сельгаспадатку. <...> А то што ў нас было? Там, брат, дзядзькі пішуць, як у іх у Задуб'і сады высякалі, пасекі знішчалі, як у нашым, параўнальна не слабым, калгасе дзесяткі калгаснікаў засталіся без кароў... <...> Трава заставалася зімаваць, а на ферме жывёла дохла, і калгаснік не меў чым карову пракарміць"* [112–113].

Для тагачаснага чытача такая сітуацыя была добра знаёмая, ён сам мог расказаць аб гэтым можа нават больш, чым пісьменнік.

Што да незавершанасці сюжэту "Крыніц", то гэты тэзіс таксама даволі спрэчны. А. Адамовіч меў на ўвазе тое, што *"ўладкаванне асабістага лёсу Лемяшэвіча, Наталлі Пятроўны, Алёшы і іншых не вычэрпвае той грамадскай праблемы, якую спрабуе паставіць у рамане пісьменнік"*[30]. Саму гэтую грамадскую праблему твора крытык фармуляваў так: *"як пойдзе далей жыццё тых жанчын, у якіх старшыня калгаса Махнач у прысутнасці Лемяшэвіча спрабаваў адабраць і спаліць сена"*[31]. Аднак узнікае пытанне: а ці ставіў пісьменнік перад сабой такую задачу? Ці мог, паказваючы часы самага пачатку зрухаў у жыцці вёскі, тут жа гаварыць аб іх выніках? Ды й наогул не мае, як правіла, сучасны раман завершанага сюжэту, бо жыццё не спыняецца, замест адных супярэчнасцей узнікаюць другія.

Можна, відаць, адзначыць наяўнасць у рамане і некаторай ілюстрацыйнасці, і пэўнай рамантычнай ідэалізацыі вобразаў асобных персанажаў. Але ў якіх творах той пары (ды й пазней) гэтага не было, і часта ў куды як большай ступені? Можна ў нейкай меры пагадзіцца і з тым, што, магчыма, не ўсе праблемы сучаснасці варта было закранаць у творы, каб сканцэнтравацца на асноўных. Аднак у жыцці ўсё неаддзельнае адно ад другога. Тым больш не выпадала так ці іначай не згадаць вядомыя пастановы, з якімі былі непасрэдна звязаныя важныя змены ў жыцці народа.

Відавочна не вытрымлівае крытыкі і думка А.Адамовіча аб маралізатарстве як асноўным спосабе раскрыцця характару Бародкі - характар гэты выяўляецца пераважна праз дзеянне. І наогул у ацэнцы гэтага аднаго з важнейшых вобразаў рамана крытык некалькі непаслядоўны.

*"У вобразе Бародкі І. Шамякін імкнецца выявіць свае адносіны да той грамадскай з'явы, якая атрымала назву "культу асобы". Добра, што пісьменнік хоча раскрыць псіхалагічную складанасць вобраза Бародкі, не малюе яго адной фарбай,"* – слушна зазначае ён. І тут жа фактычна абвяргае ўласны тэзіс, папракаючы аўтара твора ў тым, што той *"вельмі ўжо клапоціцца, як бы лішне не "пакрыўдзіць" Бародку, не засланіць тое становучае, што ёсць у гэтым чалавеку. <...> А здаецца, пісьменніка павінна больш хваляваць пытанне: як направіць тое, што папсаваў Бародка і папсаваў вельмі*

---

[30] *Адамовіч, А.* Крыніцы б'юць з глыбінь... – С. 3.
[31] Тамсама. – С. 3.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*сур'ёзна, іменна дзякуючы сваім "станоўчым" якасцям, якія так падкрэслівае І. Шамякін – энергічнасці, сіле волі і г. д."*[32]

Але ж калі гэта так, то тады заганныя паводзіны героя тлумачацца выключна яго асабістымі якасцямі і ніякім чынам – грамадска-палітычнай атмасферай часоў культу. Ды й няўжо энергічнасць, сіла волі – рысы адназначна адмоўныя?

Думаецца, выпускаў з-пад увагі А. Адамовіч і тое, што "Крыніцы" пісаліся і з мэтай уздзеяння на свядомасць чытачоў праз стварэнне прывабных вобразаў "герояў новага часу". Мастак слова маляваў карціну рэчаіснасці, характары людзей не толькі такімі, якімі бачыў, але ў нечым і такімі, якімі хацеў бачыць. І больш засяроджваў увагу бадай іменна на шляхах пераадолення вынікаў культаўскіх часоў.

Відаць, наяўнасць некаторых "перахлёстаў" у выказваннях А.Адамовіча і выклікала пярэчанні з боку іншых крытыкаў і пісьменнікаў. Літаральна праз тыдзень у штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва" з'явіўся артыкул Т. Хадкевіча "Ці такой павінна быць крытыка?"[33] У ім пісьменнік, па сутнасці, пратэставаў супраць "аглабельнай" крытыкі, якая адмоўна адбіваецца на развіцці літаратуры.

"Усе мы супраць халтуры ў мастацтве ўвогуле і літаратуры ў прыватнасці, *супраць ідэйна шкодных твораў, супраць твораў шэрых, якія нічога не даюць чытачу і псуюць яго мастацкі густ. І ў той жа час мы за кожны новы твор, у якім праўдзіва, у мастацкіх вобразах адлюстроўваецца жыццё народа, за кожны твор, які прыносіць карысць народу, дапамагае нам у будаўніцтве камунізму. Мы ад душы радуемся такому твору і павінны падтрымліваць усё новае, каштоўнае, таленавітае, што ў ім ёсць.*

*І вельмі шкада, што некаторыя крытыкі і рэцэнзенты забываюцца пра гэта і з нейкага часу прытрымліваюцца дзіўнага і безадказнага прынцыпу ў адносінах да пісьменнікаў: "Ваша справа – пісаць, наша справа – біць""*[34].

У якасці прыкладу такіх адносін Т. Хадкевіч прыводзіў сярод іншых і згаданую рэцэнзію А.Адамовіча на раман І. Шамякіна "Крыніцы".

*"Здзіўляюць у артыкуле не папрокі і заўвагі, а вывады і тон, якім яны вымаўляюцца. Стаўшы ў позу настаўніка і ўявіўшы, што перад ім не пісьменнік, а школьнік, А. Адамовіч піша: "Мы шчыра верым, што сапраўды вартыя таленту І. Шамякіна творы яшчэ не напісаны ім, яны з'явяцца, калі пісьменнік знойдзе ў сабе сілу поўнасцю адмовіцца ад ілюстрацыйнасці, калі мастак стане больш народным у поглядзе на жыццё, на чалавека, у мове". <...> Незвычайная лёгкасць, з якой іншы раз крытыкі ў нас ставяцца*

[32] *Адамовіч, А.* Крыніцы б'юць з глыбінь... – С. 3.

[33] *Хадкевіч, Т.* Ці такой павінна быць крытыка?.. – С. 3.

[34] Тамсама. – С. 3.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*да працы пісьменніка і абыходзяцца з асобнымі творамі, не можа не выклікаць пачуцця прыкрасці і раздражнення"*[35].

Нязгода з некаторымі высновамі А. Адамовіча выявілася і ў артыкуле Я. Герцовіча "Героі і народ"[36]. У прыватнасці, крытык падкрэсліваў, што І. Шамякін праявіў пэўную творчую смеласць, калі адышоў ад шаблону, паводле якога партыйнага кіраўніка можна маляваць толькі аднымі светлымі фарбамі, што вобраз сакратара райкома Бародкі, "гаспадара", кар'ерыста, адарванага ад народа, узяты з жыцця.

*"Дыягназ пісьменнікам пастаўлены правільна. Ён назваў хваробу, дэталёва апісаў яе сімптомы, знешнія адзнакі, паказаў яе шкоднасць"*[37], – гаворыць Я. Герцовіч пра абмалёўку вобраза Бародкі ў рамане.

І разам з тым папракае аўтара рамана ў тым, што той не паказаў "мікроб", які гэтую хваробу выклікаў.

*"А варта было б, між іншым, больш крытычна паставіцца да дзейнасці сакратара абкома партыі Малашанкі і адказнага партыйнага работніка Жураўскага, і многае б праяснілася б у вобразе Бародкі"*[38], – адзначаў крытык.

Тое, што вышэйшыя інстанцыі куды больш цікавілі зводкі ды рапарты, чым асобы падначаленых, безумоўна, у многім садзейнічала фарміраванню характару кіраўнікоў тыпу Бародкі. Разам з тым папрок аўтару за імкненне зняць віну з Малашанкі і Жураўскага, думаецца, не зусім аргументаваны. Урэшце, Я. Герцовіч і сам сабе ў нечым супярэчыў, калі пісаў наступнае: *"На канферэнцыі камуністы гавораць, што Бародка не павінен больш кіраваць раёнам, а сакратар абкома заяўляе: "Ён зробіць... з вашай прынцыповай крытыкі правільныя вывады". Работнік ЦК Жураўскі таксама лічыць, што "такімі, як Бародка, мы не можам раскідвацца. А паправіць яго ў нас заўсёды сілы хопіць".*

*Вось калі ўспомніш гэтыя факты, тады высвятляюцца і прычыны разлажэння Бародкі"*[39].

Але ж хіба гэтыя факты ўзятыя не з рамана і чытач не можа сам зрабіць з іх адпаведныя высновы?

Бадай, найбольш узважаную пазіцыю ў размове пра "Крыніцы" заняў Д. Палітыка, які перавёў размову аб гэтым творы ў рэчышча асэнсавання тэндэнцый развіцця ўсёй беларускай літаратуры. У артыкуле "Не звужаць творчай размовы" ён падкрэсліў, што "Крыніцы" з'яўляюцца значным творам,

---

[35] *Хадкевіч, Т.* Ці такой павінна быць крытыка?.. – С. 3.
[36] *Герцовіч, Я.* Героі і народ / Я. Герцовіч // Літаратура і мастацтва. – 1956. – 21 ліп. – С. 2–3.
[37] Тамсама. – С. 2.
[38] Тамсама. – С. 3.
[39] Тамсама. – С. 3.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вартым *"стаць прадметам вялікай творчай размовы, якая выяўляе наша больш глыбокае разуменне задач літаратуры ў святле барацьбы партыі за пераадоленне вынікаў культу асобы. <...> Гэтая размова выйшла за рамкі ацэнкі ролі і значэння рамана "Крыніцы". Яна прыняла характар перспектыўнай размовы аб адносінах нашай літаратуры да сацыялістычнай рэчаіснасці, аб паглыбленні сувязі савецкай літаратуры з народным жыццём, аб тым, што перашкаджае многім нашым творам стаць народнымі і партыйнымі ў сапраўдным сэнсе гэтых слоў"*[40].

Аўтар артыкула не пагаджаўся з тэзісам А.Адамовіча аб рамане як цалкам ілюстрацыйным.

*"Наадварот, І. Шамякін зрабіў рашучую спробу пераадолець ілюстрацыйнасць і дэкларацыйнасць у адлюстраванні калгаснага жыцця, узняў у сваім рамане важныя праблемы сучаснай вёскі, загаварыў аб ролі інтэлігенцыі ў выхаванні новых адносін да сельскагаспадарчай працы, аб яе сувязі з народам, аб перабудове кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, аб выхаванні новай маралі <...>"*[41].

Д. Палітыка сцвярджаў, што пісьменніку *"ўдалося стварыць жывыя запамінальныя вобразы людзей – энтузіястаў камуністычнага будаўніцтва. Гэта Даніла Платонавіч, Наталля Пятроўна, дырэктар МТС Рашчэня, галоўны механік Сяргей Касцянок, старшыня выканкома райсавета, а затым калгаса Валатовіч, камсамольцы Алёша Касцянок, Рая і інш. Выразна паказаны героі, праз якіх раскрываюцца ценявыя бакі жыцця. Вобразы старшыні калгаса Махнача, сакратара райкома партыі Бародкі, інжынера МТС Баранава, завуча Арэшкіна, калгасніцы Снегірыхі – сведчанне глыбокага пранікнення пісьменніка ў справы сучаснай калгаснай вёскі.*

*Можна пералічыць дзесяткі месц у кнізе, напісаных таленавіта, смела і ярка, з вялікім разуменнем рэальнай рэчаіснасці, праўды чалавечых пачуццяў і думак, характараў і адносін"*[42].

Што ж да праяў ілюстрацыйнасці, то Д. Палітыка не без пэўных падстаў казаў аб тым, што *"мастацкі не ўватканай ў тканіну твора здаецца тая частка, дзе пісьменік расказвае пра дырэктара школы Лемяшэвіча ў час вучобы яго ў аспірантуры, пра яго знаёмства з Жураўскім. Швы штучных пісьменніцкіх "аперацый" ляжаць і на ўсім апавяданні аб прыездзе Жураўскага ў раён на месца Бародкі"*[43]. І прычынай таго крытык лічыў не светапогляд І. Шамякіна, а яго пралікі ў кампазіцыі твора.

---

[40] *Палітыка, Д.* Не звужаць творчай размовы... – С. 2.

[41] Тамсама. – С. 2.

[42] *Палітыка, Д.* Не звужаць творчай размовы / Д. Палітыка // Літаратура і мастацтва. – 1956. – 4 жн. – С. 3.

[43] Тамсама. – С. 3.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*"Калі гэта ўсё прыняць за кампазіцыйны прыём пісьменніка, які спатрэбіўся яму для таго, каб затым звесці герояў у Крыніцах, дык тады трэба сказаць, што занадта вялікія мастацкія выдаткі зроблены аўтарам"*[44].

Нямала слушнага было сказана пра "Крыніцы" і ў артыкуле А. Кучара "Далей ад торных дарог!"[45] Крытык бадай першым сфармуляваў галоўную ідэю твора.

*"Думка пісьменніка глыбока актуальная і правільная: дзякуючы выкрыццю партыяй шкодных вынікаў культу асобы, у апошні перыяд жыцця нашай Радзімы, які насычаны вялікімі падзеямі, забілі новыя "крыніцы" народнай ініцыятывы. Аўтар паказаў, як людзі, што глыбока адчуваюць патрэбы народа, прыходзяць на змену дэмагогам, якія даўно адарваліся ад народа, хітрым фразёрам і балбатунам"*[46].

Заслужана высока былі ацэнены А. Кучарам вобразы Бародкі, Полаза, Махнача. У сувязі з гэтым крытык адзначаў наступнае.

*"Сярод іншых твораў апошніх год раман Шамякіна вылучаецца адсутнасцю ў ім схемы пры паказе людзей, асабліва ў першай яго частцы. Узаемаадносіны паміж людзьмі складаныя, учынкі іх часамі цяжка прадбачыць, яны дзейнічаюць па ўласнай логіцы, якая супадае з логікай развіцця вобраза, намечанай аўтарам"*[47].

А. Кучар, у прыватнасці, першым звярнуў увагу на вобраз Аксінні Хвядосаўны Снягір, *"якая сама сумленна працуе ў калгасе, але дачку хоча выгадаваць "інтэлігенткай", каб яна не зазнала сялянскай працы"*[48].

А. Кучар адзначаў, што, у адрозненне ад літаратурных крытыкаў, у выказваннях якіх адчуваецца *"поўная незадаволенасць як асобнымі вобразамі, так і агульнай канцэпцыяй твора"*, "Крыніцы" сустрэты чытачом *"дужа прыхільна і з вялікай цікавасцю"*[49]. Вельмі цікавымі з'яўляюцца і разважанні крытыка аб прычыне папулярнасці ў чытачоў нават самых першых твораў пісьменніка.

*"У мяне асабіста склалася глыбокае перакананне, што майстэрства ўздзеяння на чытача, на яго сэрца і пачуцці – гэта мастацкае майстэрства, калі мець на ўвазе, што аўтар не патрапляе дрэнным густам чытача. А ў Шамякіна гэтага амаль ніколі не бывала. Сакрэт любві, якую заваяваў першы твор яго ў чытача, у тым, што аўтар выбраў аб'ектам паказу*

---

[44] *Палітыка, Д.* Не звужаць творчай размовы / Д. Палітыка // Літаратура і мастацтва. – 1956. – 4 жн. – С. 3.

[45] *Кучар, А.* Далей ад торных дарог! / А. Кучар // Літаратура і мастацтва. – 1956. – 22 вер. – С. 2.

[46] Тамсама. – С. 2.

[47] Тамсама. – С. 2.

[48] *Кучар, А.* Далей ад торных дарог!.. – С. 2.

[49] Тамсама. – С. 2.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*тыповую сям'ю селяніна, думы і настроі якой былі зразумелыя і блізкія для многіх людзей, што перажылі вайну. Ён правільна зразумеў сутнасць патрыятычнага подзвігу савецкага народа, назваўшы яго "глыбокай плынню". Пісьменнік змог паказаць карціны жыцця праз многія праўдзівыя дэталі, побыт. Яго твор быў вывераны па лепшым вымяральніку - сэрцы чытача. Першы твор Шамякіна, як, дарэчы, і наступныя, не складаны, крыху сентыментальны, а, галоўнае, праўдзівы, а гэта заўсёды цэніць чытач. Трэба яшчэ дадаць, што пісьменнік добра валодае кампазіцыяй. Творы яго зграбныя, нерасцягнутыя і нескамечаныя"*[50].

Няхай даруе чытач такую доўгую цытату, але высновы з яе цікавыя, па меншай меры, у трох аспектах. Па-першае, А.Кучар сцвярджаў думку аб народнасці як зместу, так і формы нават самага першага рамана І. Шамякіна. Па-другое, ён з пэўнасцю прадракаў поспех у чытача і рамана "Крыніцы", які *"па глыбіні ўзнятай праблемы, безумоўна, стаіць вышэй за дзве папярэднія кнігі"*[51]. І, па-трэцяе, крытык вельмі дакладна ахарактарызаваў многія істотныя рысы творчай манеры пісьменніка.

Разам з тым, А. Кучар часам таксама выказвае ўзаемавыключныя меркаванні.

*"Ідэя – жыць для народа – гэта ідэя галоўнага героя рамана Лемяшэвіча. Іменна яна прымусіла яго, будучага кандыдата навук, кінуць сталіцу і пайсці працаваць у школу." А крыху далей чытаем: "Рашэнне Лемяшэвіча паехаць у вёску не матывавана: у вёсцы ён занадта лёгка заваёўвае аўтарытэт, яму лёгка было адолець Арэшкіна"*[52].

У гэтым выпадку А.Кучар у нечым пярэчыў сам сабе, бо раней адзначаў, што ў вёсцы "аўтар ставіць свайго героя ў складаныя ўзаемаадносіны" – той выступае супраць Бародкі, Махнача, Арэшкіна, Прыходчанкі, знаходзіцца ў складаных адносінах і з Сяргеем Касцянком"[53]. Ёсць пэўная нестыкоўка і ў тым, што крытык, сцвярджаючы, што героі рамана *"дзейнічаюць па ўласнай логіцы, якая супадае з логікай развіцця вобраза, намечанай аўтарам"*, выказвае між тым думку аб схематызме ў вырашэнні несхематычных канфліктаў паміж героямі: *"аўтар сам па пэўнай схеме змагаецца супраць схематызму"*[54].

Падобныя, больш ці менш відавочныя ўнутраныя супярэчнасці можна заўважыць у кожным, бадай, з разгледжаных артыкулаў. На першы погляд, гэта можа ўспрымацца як вынік няўважлівасці іх аўтараў да захавання логікі

[50] *Кучар, А.* Далей ад торных дарог!.. – С. 2.
[51] Тамсама. – С. 2.
[52] Тамсама. – С. 2.
[53] Тамсама. – С. 2.
[54] Тамсама. – С. 2.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ва ўласных выказваннях. Аднак, думаецца, справа была не ў гэтым. Тады, пасля зусім яшчэ нядаўняга XX з'езду КПСС, крытыкі рашуча выступалі супраць схематызму, ілюстрацыйнасці, упрыгожвання рэчаіснасці, якія панавалі ў літаратуры ў часы культу асобы. Разам з тым паўставала пытанне пра напрамак далейшага развіцця савецкай літаратуры, пра воблік яе станоўчага героя. Менавіта гэта і высвятлялася ў працэсе дыскусіі аб "Крыніцах", і рабілася гэта таксама часам з пэўнымі "перахлёстамі" ў адмаўленні мастацкай спадчыны часоў культу асобы. Некаторым крытыкам здавалася, што яна павінна быць поўнасцю закрэсленая і ніякім чынам не ўплываць на літаратуру новага часу.

Таму, калі, напрыклад, А. Адамовіч гаварыў аб вобразе ўрача Наталлі Пятроўны як адным з лепшых у рамане[55], то А. Кучар прытрымліваўся дыяметральна супрацьлеглага погляду.

"*<...> я зусім не згаджаюся з маімі таварышамі-крытыкамі, якія даюць высокую ацэнку вобразам Наталлі Пятроўны і Данілы Платонавіча. Што вы, таварышы! Ды такога "благостного" настаўніка, як Даніла Платонавіч, не адмовіліся б прыняць у любы танны фільм, накшталт "Атэстата сталасці".<...> Наталля Пятроўна, праўда, крышку лепш напісана і нават сімпатычная ў асобных карцінах, але застаецца ўражанне, што сустрэча з ёй – гэта паўторная сустрэча з чалавекам, якога раней недзе бачыў*"[56].

Прычынай такога стаўлення да вобразаў названых герояў А. Кучар называў тое, што яны *"маюць літаратурныя прататыпы"*, і таму з'яўляюцца праявай літаратуршчыны[57]. Праўда, крытык меў на ўвазе не наогул адмаўленне ад паказу ў літаратуры існуючых у жыцці, але ўжо некім адкрытых раней тыпаў. Ён гаварыў аб патрэбе ў выяўленні і глыбокім асэнсаванні яшчэ не заўважаных супярэчнасцей жыцця, адыходу ад *"пратаптаных літаратурных дарог"*[58], што сапраўды было не лішнім для ўсяго тагачаснага прыгожага пісьменства.

"Дасталася" аўтару "Крыніц" і за вобраз цэнтральнага героя рамана Лемяшэвіча. Відаць, крытыкі палічылі яго галоўным літаратурным героем, нават больш – прэтэндэнтам на ролю таго самага героя новага часу, актыўнага будаўніка камунізму, якога так настойліва шукала ўся савецкая літаратура. Лемяшэвіч жа, як палічыла большасць удзельнікаў дыскусіі, да такога героя яўна "не дацягваў". А. Кучар у сувязі з гэтым пісаў наступнае.

*"Думаю, што галоўная хіба новага твора Шамякіна звязана, як аб гэтым правільна пісалі Адамовіч і Палітыка, з вобразам Лемяшэвіча. Як мог*

---

[55] *Кучар, А.* Далей ад торных дарог!.. – С. 2.
[56] Тамсама. – С. 2.
[57] Тамсама. – С. 2.
[58] Тамсама. – С. 2.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*аўтар, які даволі добра ўмее разгортваць вобраз у дзеянні, можна сказаць, драматургічна будаваць яго, забыцца на тое, што Лемяшэвіч для таго, каб чытач палюбіў яго, павінен прайсці вялікі і складаны шлях да перамогі. А гэтага няма ў рамане."*[59]

Аўтар артыкула меркаваў, што раз ужо Лемяшэвіч прыехаў у вёску, то *"інтэлект яго павінен быў быць знана больш глыбокі, кола інтарэсаў больш шырокае, думкі больш арыгінальныя, а ўчынкі больш своеасаблівыя. І, галоўнае, ён павінен* ***дзейнічаць*** [вылучана тлустым. – *М.К*]"[60].

Яшчэ больш рэзка выказаўся І. Агееў у артыкуле "Криницы должны быть чистыми!..", апублікаваным у "Советской Белоруссии" 29 верасня таго ж года.

*"Возьмите, скажем, Лемешевича, его дело. Казалось бы, герой, который по авторскому замыслу, очутился в эпицентре развернувшихся событий, должен проявиться во всей полноте.*

*Лемешевич не оправдал надежд автора. Он оказался плохим педагогом, никудышным философом и мелкотравчатым моралистом. Надо сделать усилие над собой, чтобы поверить, будто Лемешевич приехал в Криницы не затем только, чтобы... жениться на Наталье Петровне. <...> Да и свалился Лемешевич в семейную жизнь, как слепой мул в колодец, стремительностью движений немало озадачив читателя"*[61].

Вядома, сучаснага чытача могуць здзівіць такія ацэнкі. Аднак для таго часу яны былі, у прынцыпе, заканамернымі, бо вынікалі з пастулата аб станоўчым герої ў савецкай літаратуры як аб чалавеку перш за ўсё грамадскім, а не прыватным.

Увогуле, калі гаварыць аб дыскусіі вакол "Крыніц", то хацелася б адзначыць некалькі момантаў. Па-першае, на наш погляд, яе змест і тон у многім вызначаўся пэўнай эйфарыяй, якая мела месца ў поглядах на будучыню пасля зусім тады нядаўняга XX з'езду КПСС. Здавалася, што пасля яго ў грамадстве запанавала справядлівасць, дэмакратыя і свабода слова. Крытыкі справядліва лічылі, што ў такіх умовах і літаратура павінная змяніцца, пазбавіцца слядоў уплыву часоў культу асобы. Па сутнасці, размова ішла не толькі аб канкрэтным рамане І. Шамякіна, які быў прызнаны значнай падзеяй у нацыянальнай прозе. Гаворка вялася і аб рэчах не менш важных - найперш аб арыенцірах далейшага развіцця беларускага прыгожага пісьменства. І ў гэтым аспекце дыскусія мела прынцыпова важнае значэнне.

[59] *Кучар, А.* Далей ад торных дарог!.. – С. 2.
[60] Тамсама. – С. 2.
[61] Тамсама. – С. 2.
[61] *Агеев, И.* Криницы должны быть чистыми!.. / И. Агеев // Советская Белоруссия. – 1956. – 29 сент. – С. 3.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Разам з тым не лішне адзначыць, што не заўсёды літаратуразнаўцы паслядоўна прытрымліваліся прынцыпу гістарызму і часам ацэньвалі раман без уліку той грамадска-палітычнай абстаноўкі, у якой ён ствараўся. З гэтага вынікалі нямала далёка не заўсёды слушных прэтэнзій да мастака слова. Крытыкі нярэдка зыходзілі з уяўленняў пра нейкі ідэальна дасканалы твор, якога наогул не існавала ў рэальнасці, і больш гаварылі аб тым, чаго, на іх думку, не хапае ў рамане, чым аб тым, што ў ім ёсць новага і арыгінальнага.

Тым часам у рэспубліканскіх і абласных газетах з'явіўся цэлы шэраг цалкам станоўчых рэцэнзій на новы твор І. Шамякіна[62]. Іх аўтары, відаць, найперш мелі на мэце звярнуць увагу патэнцыяльнай чытацкай аўдыторыі на адметную з'яву ў беларускай літаратуры.

У 1957 годзе раман выйшаў асобным выданнем на беларускай мове с Мінску, а ў перакладзе на рускую мову А. Астроўскага быў апублікаваны ў часопісе "Раман-газета", які распаўсюджваўся тады па ўсяму Савецкаму Саюзу. Трэба сказаць, што твор адразу і надоўга заваяваў прыхільнасць шырокай чытацкай аўдыторыі. З'явіліся водгукі на раман у "Литературной газете", часопісе "Дружба народов", украінскай, малдаўскай, казахскай прэсе, якія засведчылі важкасць плёну працы мастака слова. На старонках агульнасаюзных выданняў з'явіліся водгукі на "Крыніцы" і беларускіх крытыкаў, у якіх, зазначым між іншым, даволі выразна гучала рэха "лімаўскай" дыскусіі. Больш таго, і вынікі яе, фактычна, былі падведзеныя менавіта на старонках усесаюзнага часопіса "Дружба народаў" у артыкуле В. Жыжэнка "Жить с народом"[63].

У гэтай публікацыі былі пастаўленыя многія кропкі над "і", адмеценыя многія неабгрунтаваныя папрокі пісьменніку з боку крытыкаў. У артыкуле вельмі слушна гаварылася аб тым, што галоўным пафасам твора з'яўляецца сцверджанне ідэі жыцця з народам і для народа[64], што пісьменнік *"показывает, как решения партии входят в жизнь, будят творческую активность, помогают одолевать канцелярщину и бюрократизм. Под знаком этих больших перемен развивается все действие романа"*[65]. І што *"и Бородко, и Мохнач, и завуч криницкой школы Орешкин уступили свои места другим, более*

[62] *Барсток, М.* Светлыя крыніцы жыцця / М. Барсток // Мінская праўда. – 1956. – 21 ліп.; *Дзюбайла, П.* Раман аб савецкіх настаўніках / П. Дзюбайла // Настаўніцкая газета. – 1956. – 18 кастр.; *Кажамякін, Т.* Раман аб вясковай інтэлігенцыі / Т. Кажамякін // Гомельская праўда. – 1956. – 8 ліп.; *Тараткевіч, М.* Трэці раман Івана Шамякіна / М. Тараткевіч // Віцебскі рабочы. – 1956. – 22 ліп.; *Храмава, Л.* Шчасце – у служэнні народу / Л. Храмава // Гродзенская праўда. – 1956. – 23 вер., і інш.

[63] *Жиженко, В.Л.* Жить с народом / В.Л. Жиженко // Дружба народов. – 1957. – № 7. – С. 197–201.

[64] Тамсама. – С. 197.

[65] Тамсама. – С. 198.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*достойным людям не по мановению волшебной палочки и не по собственному желанию. Сама жизнь отвергла их. И это старается показать писатель"*[66].

Вельмі рэзонна крытык пытаўся – чаму гэтая прынцыповая размова аб ілюстрацыйнасці ў прозе пачалася менавіта з выхадам у свет "Крыніц"? Чаму менавіта гэты раман так крытыкуецца за ілюстрацыйнасць, якая ў куды большай ступені выяўляецца ў многіх творах іншых пісьменнікаў? І ў той жа час адказваў на гэтыя пытанні.

*"Драматизм и углубленный психологизм, пристальный, почти декларативный интерес к личной, интимной жизни героев, умение создавать острые, неожиданные ситуации – все это, вполне естественно, привлекает читателя, приковывает его внимание. А с другой стороны, на этом живописном фоне особенно заметны и досадны срывы в схематизм и иллюстративность. Таким образом, нам кажется, что, как это ни парадоксально на первый взгляд, активность критики поддерживается именно достоинствами романа, именно яркостью и глубиной многих его сцен и образов. Поэтому упреки в иллюстративности и раздались так горячо и дружно"*[67]. І гэта было сапраўды так.

Поспех твора ў шырокай чытацкай аўдыторыі быў вялікі. Урыўкі з яго друкаваліся ў розных перыядычных выданнях, гучалі па радыё. У 1959 годзе "Крыніцы" выйшлі асобным выданнем у Маскве. У тым жа годзе за гэты твор І. Шамякін быў удастоены літаратурнай прэміі імя Я. Коласа. З часам раман быў перакладзены і на іншыя мовы народаў СССР, не раз перавыдаваўся значнымі тыражамі ў Беларусі і за яе межамі. Так, напрыклад, толькі ў Маскве ўсяго за 13 гадоў (з 1959 па 1972) раман друкаваўся асобна і разам з іншымі творамі І. Шамякіна 4 разы. Прычым адно з выданняў было зроблена спецыяльна для сляпых.

Чыталі "Крыніцы" і за межамі Савецкага Саюза. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць невялікая нататка ""Крыніцы" ў Чэхаславакіі", змешчаная ў нумары газеты "Літаратура і мастацтва" за 9 студзеня 1962 года. У ёй паведамляецца, што ў Баньскай Быстрыцы (Чэхія) адбылася канферэнцыя чытачоў, на якой абмяркоўвалася кніга Івана Шамякіна "Крыніцы". Там жа адзначаецца, што годам раней у многіх мясцінах краіны на канферэнцыях і гутарках чытачоў адбываліся дыскусіі аб гэтым творы, што чытачы ўдзячныя яго аўтару, а выдавецтва асветы ў Браціславе намервалася запрасіць І. Шамякіна на пашыраную канферэнцыю чытачоў. Відаць, праблемы, актуальныя для савецкага чытача, былі не менш надзёнымі і для жыхароў краін сацыялістычнай садружнасці.

---

[66] *Жиженко, В.Л.* Жить с народом / В.Л. Жиженко // Дружба народов. – 1957. – № 7. – С. 200.

[67] Тамсама. – С. 200.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"Крыніцы" не толькі чыталі. У 1961 годзе ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа (Віцебск) быў пастаўлены спектакль паводле рамана "Крыніцы" (аўтары І. Шамякін і Ю. Шчарбакоў). А ў 1965 годзе на кінастудыі "Беларусьфільм" завяршыліся здымкі паўнаметражнага мастацкага кінафільма "Крыніцы" (сцэнарыст І. Шамякін, пастаноўшчык І. Шульман). Фільм з поспехам дэманстраваўся па ўсяму Савецкаму Саюзу.

Ішлі гады, але цікавасць да твора не змяншалася. На працягу апошняга паўстагоддзя ён неаднаразова перавыдаваўся значнымі тыражамі. Зразумела, што ў розныя часы раман успрымаўся ў нечым па-рознаму, кожнае новае пакаленне чытачоў знаходзіла ў ім нешта блізкае. Для людзей старэйшага пакалення гэта было апавяданне аб перажытым імі, у якім усё было да дробязей знаёмае і зразумелае. Маладзейшых чытачоў раман, думаецца, прываблівАў найперш аптымізмам і глыбокім гуманізмам аўтарскай пазіцыі, сцверджаннем ідэалаў дабра і справядлівасці ў грамадскім і асабістым жыцці, вастрынёй сюжэтных калізій і глыбінёй раскрыцця характараў герояў "Крыніц" – людзей, здавалася б, звычайных, і разам з тым неардынарных. У той жа час для ўсіх чытачоў "Крыніцы" былі блізкімі пафасам пратэсту супраць такой з'явы, як "бародкаўшчына". Здавалася, і доўга здавалася, што яна вось-вось згіне. Але культ асобы змяніўся чарговымі культцікамі, а Бародкі розных маштабаў, бюракратычная сістэма па-ранейшаму правілі баль.

Станавілася ясным, што "бародкаўшчыну" выкарчаваць не так проста. Гэтае разуменне ўскосна адбілася і ў ацэнках рамана ў працах літаратуразнаўцаў. У адной з іх, напрыклад, адзначалася наступнае.

*"Лемяшэвіч выступае супраць Бародкі, не разумеючы ўсёй жывучасці і небяспечнасці такой сацыяльнай з'явы, як бародкаўшчына. <...> Ён не бачыць яе праяў у калгасе, дзе "гаспадарыць" Махнач. Канфлікт Лемяшэвіча з Бародкам, жыццёвы, востры, па сутнасці ўзнік на аснове прыватных фактаў, а не ў сувязі з сутыкненнем розных поглядаў, характараў. У адносінах да праблем сельскага жыцця, якое не магло не турбаваць героя, не наводзіць на складаныя роздумы, бо ён жыве ў вёсцы ў нялёгкі для яе час, з'яўляецца дырэктарам сельскай школы, грамадская актыўнасць амаль не праяўляецца, калі не лічыць некалькіх сутычак са старшынёй калгаса Махначом"* [68].

Так, сапраўды Лемяшэвіч не бачыў, ды й наўрад ці мог прадбачыць жывучасць бародкаўшчыны. Крытыкі яшчэ часам па-ранейшаму патрабуюць ад героя проста неверагоднай для звычайнага чалавека пранікліваасці і грамадзянскай актыўнасці. А ад пісьменніка – адлюстравання выключна грамадскіх, сацыяльных канфліктаў, што лічылася найважнейшай задачай

[68] Беларуская савецкая проза. Раман і аповесць. – Мінск: Навука і тэхніка, 1971. – С. 283.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

савецкай літаратуры. Аднак паступова тон гаворкі аб рамане мяняўся. Усё больш выразна акцэнтавалася думка аб тым, што "Крыніцы" – выдатная з'ява ў беларускай літаратуры сярэдзіны 50-х гадоў. Значна дакладней вызначаецца ў той час і роля вобраза Лемяшэвіча ў мастацкай структуры твора. А. Адамовіч, у прыватнасці, пісаў: *"Композиционная роль этого образа в романе, по замыслу автора, очень значительна: Лемяшевич оказывается как бы в центре тех событий, что развертываются в районе"*[69]. І далей: "Но настоящим художественным открытием Шамякина является образ Бородки. Тут Шамякин был действительно одним из первых, и если шел за кем, то сразу же за Овечкиным, развивая тему, которая воистину носилась в воздухе"[70].

Такім чынам, падкрэслівалася, што вобраз Лемяшэвіча - адзін з цэнтральных, але не галоўны вобраз у рамане. У пачатку 80-х С.Андраюк скажа аб гэтым больш выразна.

*"<...> ў сістэме вобразаў рамана сваёй жыццёвай напоўненасцю, мастацкай выразнасцю і акрэсленасцю найбольш вылучаецца вобраз Барoдкі. Вобраз адмоўны. У творы ж, па ідэйна-мастацкай нагрузцы, ён з'яўляецца галоўным. Сутнасць часу, характар перамен у ім адбіваюцца найбольш яскрава"* [71].

С. Андраюк адзначыць, што вобраз Бародкі раскрываецца *"ў асноўным праз дзеянне, у плане сацыяльным, таму што ён сам – гэта не столькі непаўторна-індывідуальны чалавечы характар, колькі ўвасабленне і выяўленне пэўных грамадска-сацыяльных тэндэнцый"*[72].

Больш выразна выяўляецца ў літаратуразнаўчых працах і разуменне паяднанасці грамадскага і асабістага ў жыцці чалавека. Ці не першым думку аб іх арганічным спалучэнні ў светаразуменні герояў рамана "Крыніцы" як аб станоўчай якасці выказаў С. Майхровіч[73]. Гэты тэзіс знайшоў далейшае развіццё ў манаграфіі А. Адамовіча "Літаратура, мы і час".

*"Мы зусім не хочам сказаць, што пачуццё кахання і наогул "асабістыя справы" людзей у І. Шамякіна – на другім плане і што гэта – нешта другараднае для мастака. Зусім наадварот. Але размова ідзе аб тым, што і пачуццё кахання і іншыя чалавечыя пачуцці І. Шамякін раскрывае асабліва поўна і ярка, калі ён паказвае чалавека як "грамадскага чалавека". <...> Чым вабіць паэтычны вобраз сельскага ўрача Наташы з рамана "Крыніцы"? Яе адносінамі да закаханых у яе Сяргея і Лемяшэвіча? І гэтым. Але*

---

[69] *Адамович, А.* День бегущий // Адамович А. Горизонты белорусской прозы / А. Адамович. – М.: Сов. писатель, 1974. – С. 98–112.

[70] Тамсама.

[71] *Андраюк, С.* Традыцыі і сучаснасць / С.А. Андраюк. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – С. 95.

[72] Тамсама. – С. 96.

[73] *Майхровіч, С.* Іван Шамякін: нарыс жыцця і творчасці / С. Майхровіч. – Мінск: Маст. літ., 1978. – С. 95.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*больш за ўсё адносінамі яе, самааддана̄й жанчыны з нялёгкай біяграфіяй, да сваёй справы, а яе справа – людзі, іх няшчасці і радасці. Адбярыце ўсё гэта, няхай застануцца толькі асабістыя дачыненні гераіні да Сяргея, Лемяшэвіча, і мастацкі вобраз страціць унутранае святло"*[74],– адзначаў А. Адамовіч. Не пагадзіцца з гэтым цяжка.

Увогуле варта адзначыць, што ацэнка рамана прафесійнымі літаратуразнаўцамі паступова станавілася ўсё больш аб'ектыўнай. У даперабудовачны перыяд гэта асабліва, бадай, выразна выяўляецца ў акадэмічнай "Истории белорусской советской литературы" (Мінск, 1977) і працах вядомага даследчыка гісторыі беларускай літаратуры В.Каваленкі, напісаных у 70–80-х гадах. У манаграфіі "Іван Шамякін: Нарыс жыцця і творчасці" (1980) ён, у прыватнасці, зазначае, што ў самім прыездзе Лемяшэвіча ў вёску з мэтай накаплення практычнага вопыту для дысертацыі выявіўся сам дух таго часу – павярнуцца тварам да практыкі, да канкрэтных патрэб народа[75]. Упаўне рэзонна гаворыць даследчык і аб тым, што самаабмежаванасць Лемяшэвіча ў грамадскай актыўнасці, за якую крытыкі папракалі І. Шамякіна, – не ўпушчэнне ці пралік пісьменніка, а праўда жыцця і праўда мастацкага характару, што герой паводзіць сябе *"як звычайны чалавек. І робіць ён у барацьбе за новае роўна столькі, на колькі быў здатны чалавек таго часу"*[76].

В. Каваленка падкрэслівае, што Лемяшэвіч – чалавек прыстойны, сумленны і прынцыповы, а таму проста не можа мірыцца з праявамі амаральнасці ў паводзінах каго б там ні было: Бародкі, Арэшкіна ці каго яшчэ. Менавіта чалавечыя якасці прыцягваюць да Лемяшэвіча ўсіх сумленных людзей. Гэта ў поўнай меры адносіцца і да настаўнікаў, згуртаванню якіх вакол новага дырэктара спрыяла апроч іншага і наяўнасць у яго рыс, неабходных добраму кіраўніку.

Бадай першым адзначыў В. Каваленка і выяўленае ў рамане майстэрстве пісьменніка "ў паказе сходаў, пасяджэнняў бюро, кабінетнай працы адміністрацыйных кіраўнікоў"[77], якое не ў меншай ступені выявілася пазней і ў рамане "Атланты і карыятыды".

*"У рамане "Крыніцы" І. Шамякін падняў на новую ступень паэтыку прафесійнай справы з яе турботамі і канфліктамі, сумненнямі, пошукамі і барацьбой"*[78], – зазначаў даследчык. Вельмі слушная і яго заўвага, што Бародка – *"ахвяра няправільнага, шкоднага метаду кіраўніцтва і яго ваяўнічы*

---

[74] *Адамовіч, А.* Літаратура, мы і час / А. Адамовіч. – Мінск: Маст. літ., 1979. – С. 101.

[75] *Каваленка, В.* Іван Шамякін: Нарыс жыцця і творчасці / В. Каваленка. – Мінск: Нар. асвета, 1980. – С. 75.

[76] Тамсама. – С. 78.

[77] Тамсама. – С. 84.

[78] Тамсама. – С. 84.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*носьбіт.* абаронца. Так, у гэтым ёсць свая дыялектыка. Бародку такім, якім ён стаў, зрабілі ўмовы і, магчыма, супраць яго волі, але, паддаўшыся націску гэтых абставін, ён сам стаў сілай, якая падпарадкоўвала сабе іншых"[79].

В. Каваленка адзначыў таксама, што "Крыніцы" – лепшы раман у беларускай літаратуры другой паловы 50-х гадоў.

*"Здавалася б, поспех аповесці "На Быстранцы" і рамана "Крыніцы" прадвяшчаў далейшы імклівы ўзлёт жанру рамана. Аднак першыя гады, якія прайшлі пасля з'яўлення "Крыніц", не пацвярджалі гэтага радаснага прадчування"*[80].

Нямала гадоў мінула з тае пары, калі адбываліся адлюстраваныя ў "Крыніцах" падзеі, калі сам твор прыдзірліва разглядаўся літаратурнай крытыкай з пункту погляду яго адпаведнасці крытэрыям ідэйнасці і мастацкасці, вызначаных марксісцка-ленінскім вучэннем. Ледзь не тры дзесяцігоддзі таму гэтае вучэнне перастала быць пануючай у грамадстве ідэалогіяй, тады ж адышла ў нябыт і сама эпоха будаўніцтва камунізму. Змяніўся светапогляд людзей, змяніліся абставіны жыцця. Міжволі паўстае пытанне: ці не стаў раман "Крыніцы" проста фактам гісторыі літаратуры, які цікавіць толькі літаратуразнаўцаў? І як яны зараз ацэньваюць гэты твор, якое месца адводзяць яму ў гісторыі беларускага прыгожага пісьменства?

Знаёмства з працамі гісторыкаў айчыннай літаратуры сведчыць, што і зараз раман ацэньваецца імі як адзін з лепшых у беларускай прозе другой паловы XX стагоддзя, этапны ў творчасці самога пісьменніка[81]. Іншая справа, што некаторыя моманты ў рамане з пункту погляду сучаснасці бачацца інача, чым у дапрабудовачныя часы.

Так, М. Тычына, разважаючы пра творчасць І. Шамякіна, зазначае: *"Утылітарны падыход да мастацкай літаратуры як да "агульнапартыйнай справы" тут навідавоку – усё тое, што сёння ўспрымаецца з адзнакай "устарэлае"*[82]. Аднак, на думку даследчыка, гэта ні ў якай меры не закрэслівае мастацкай каштоўнасці твора.

*"Акрамя чыста ідэалагічнага, "агульнапартыйнага" пласта ў змесце шамякінскіх твораў заўсёды прысутнічае і ўласна чалавечы, этычны і эстэтычны сэнс, які прываблівае, а часам і захапляе нават у "адыёзных", на*

[79] *Каваленка, В.* Іван Шамякін: Нарыс жыцця і творчасці / В. Каваленка. – Мінск: Нар. асвета, 1980. – С. 79.

[80] *Каваленка, В.А.* Веліч праўды: Выбранае / В.А. Каваленка. – Мінск: Маст. літ., 1989. – С. 79.

[81] Аб гэтым: *Гніламёдаў, У.* Пісьменнік дзвюх эпох / У. Гніламёдаў // Полымя. – 2009. – № 11. – С. 139–166; *Локун, В.* Легенды і праўда жыцця / В. Локун // Полымя. – 1996. – № 1. – С. 341–371; *Тычына, М.* Усё чалавечае / М. Тычына // Роднае слова. – 2001. – № 1. – С. 8–14.

[81] *Тычына, М.* Усё чалавечае ... – С. 9.

[82] Тамсама. – С. 9.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*сённяшні погляд, творах "ленініяны", творах "на рэвалюцыйную тэму", "тэму пабудовы сацыялізма і камунізма" і г. д."*[83].

М. Тычына адзначае, што ў кожным рамане пісьменніка 40–50-х гадоў, *"апрача звыклай атрыбутыкі сацрэалізму ("валявы герой", аднаўленне гаспадаркі", "вытворчыя канфлікты"), прысутнічаюць моманты, сюжэтныя "вузлы", на якіх чытацкая цікаўнасць міжволі абвастраецца. <...> У рамане "Крыніцы" гэта апісанне любоўнай гісторыі дырэктара школы Лемяшэвіча і вясковай фельчаркі Марозавай. Героі, такія "правільныя" ва ўсім, што тычыцца грамадскай сферы, паводзяць сябе абсалютна адвольна ў інтымным жыцці, у дачыненнях паміж сабою "на побытавым узроўні", падпарадкуючыся не агульным вымогам сацыялістычнай маралі, а сваёй прыродзе, тэмпераменту, законам жывой, нічым не зашоранай любоўнай страсці"*[84].

Заўвага, бясспрэчна, слушная. Застаецца хіба дадаць, што такіх сюжэтных "вузлоў", якія здольныя прыкаваць увагу чытача, у рамане шмат. Тут можна ўзгадаць і перапетыі адносін Алёшы Касцянка і Раі, Сяргея Касцянка і Марозавай, Марыны Астапаўны Прыходчанкі і Бародкі, Паўла Кавальчука і яго жонкі. Вобразы персанажаў рамана "Крыніцы" ўвогуле вызначаюцца жыццёвай праўдзівасцю, паўнакроўнасцю, і раскрываюцца мастаком слова ва ўсёй іх унутранай супярэчлівасці і чалавечай сутнасці. Раман застаецца прыцягальным і для сённяшняга чытача ўменнем пісьменніка ўвасабляць менавіта чалавечы змест усяго існага, імклівым развіццём сюжэта, майстэрствам апавядання і выразным гуманістычным пафасам, аптымістычным поглядам мастака слова на жыццё.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова